Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניגט זיך!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ ГАЗЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СУБОТА
11 ліпеня 1931 г.
№ 157 (3246)

СЕНЬНЯ XI-ГОДЗЬДЗЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, гераічнымі намаганьнямі Чырвонай арміі, пры дапамозе пралетарыяту ўсяго СССР, БССР, дабіўшыся вызваленьня ад белапольскай акупацыі, за 11 год дасягнула вялізарнейшых посьпехаў у будаўніцтве сацыялізму

Няхай жыве камуністычная партыя—арганізатар і кіраўнік пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва

Дата вызваленьня

11-га ліпеня—гэта яскравая дата ў слаўнай мінуўшчыне рабочае клясы і сялянства Беларусі, мінуўшчыне, якая выкоўвалася ў агні запятай клясавай барацьбы супроць імпэрыялістычных паезьнікаў і іх саюзьнікаў—беларускай буржуазіі. Працоўныя масы Беларусі пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго кампартыі збройнай сілай зьверглі панаваньне Пілсудзкага і яго палечнікаў з Найвышэйшай Рады—Лёсікаў, Смолічаў, Краскоўскіх і гэтым дабіліся вызваленьня з-пад сацыяльнага і нацыянальнага ўціску.

Толькі дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі пралетарыят ідучы на чале паўстаўшых мас—усенароднай рэвалюцыі, нёс вызваленьне для эксплёатуемых і прыгнечаных мас для паняволеных народаў, толькі дзякуючы дапамозе клясавых братоў усіх народаў былай царскай Расіі, працоўныя масы Беларусі змаглі прагнаць крывавых акупантаў і ўзяць у свае рукі, фабрыкі, зямлю і ўладу.

Лёзунгі кампартыі, пад якімі змаглі ся адзінаццаць год назад працоўныя масы Беларусі, ператварыліся цяпер у жыцьцё, сталі жывой справай, ущелясьнюцца сацыялістычным будаўніцтвам, бо гэтыя лёзунгі былі лёзунгамі шырокіх працоўных мас, былі выяўленьнем волі і інтарэсу гэтых мас.

Дыктатура пралетарыяту, рабоча-сялянская ўлада, дзякуючы правільнай ленінскай нацыянальнай палітыцы, за бясьпечыла эканамічную і нацыянальную незалежнасьць Беларусі, стварыла неабходныя абставіны для ператварэньня заняпалага, адсталага краю ў край прамыслова-калгасны пры буйным росквіце сваёй пралетарскай культуры. А ўсямерная салідарная дапамога брацкіх рэспублік садзейнічае шпаркім тэмпам індустрыялізацыі народнай гаспадаркі і сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі ў БССР.

Адзінаццаць год вызваленьня з-пад імпэрыялістычнай польскай акупацыі супадае з трэцім рашаючым годам пяцігодкі, у якім заканчваецца пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў маладой пралетарскай рэспубліцы. Рашуча і з посьпехам ломячы супраціўленьне і шкодніцтва капіталістычных рэшткаў—кулацтва і іх палітычных выяўнікоў—шацэмаў, кампартыя пераможна вядзе масы па шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

БССР займае адно з пачэсных месц у сацыялістычных лічбах «518» і «1040», у БССР зьліквідавана назаўсёды найгоршая злыбеда пралетарыяту—беспрацоўе; калектывізацыя на 1 ліпеня г. г. дасягнула 41 проц., у гэтым годзе ліквідуецца няпісьменнасьць. Кампартыя пры ўдзеле ДПУ—гэтае стражы дыктатуры пралетарыяту, ачысьціўшы шэрагі будаўнікоў сацыялізму ад шкоднікаў, дала магчымасьць з большай энэргіяй і сілай павесьці разгорнутае ўсім фронтам сацыялістычнае наступленьне. Новыя і новыя калёны ўдарнікаў і энтузіястаў, герояў цяжкіх, але пачэсных будняў, ідуць цьвёрдым крокам да новае перамогі на новыя высоты сацыялістычнага гмаху.

У гэты-ж час там, за польскай мяжой працоўныя масы Заходняй Беларусі, нясучы ярмо польскай фашысцкай акупацыі, знаходзяцца ў рэзка процілеглым палажэньні. Кожны год, кожны месяц прыносіць там новыя формы эксплёатацыі і прыгнечаньня, якія кідаюць працоўныя масы ўсё глыбей у галечу, беспрацоўе, голад. Калі ў даваенны час заходняя частка Беларусі ішла наперадзе ў сваім гаспадарчым і прамысловым жыцьці ў адносінах да ўсходняй часткі, дык цяпер Заходняя Беларусь, пасьля дзясятка гадоў акупацыі, прадстаўляе агульную гаспадарчую руіну з крывавымі рубцамі ад ударaў карных экспэдыцыяў, ад пінкоў бота фашысцкага акупанта.

Гаспадарчы, а цяпер фінансавы крызіс, у ціскох якога курчыцца капіталістычна-абрашніцкая Польшча, фашысцкая дыктатура хоча зьмякчыць гэты крызіс коштам узмацненьня сваёй грабежніцка-калёніяльнай палітыкі на заграбленых украінскіх і беларускіх землях. (У той час, калі ў Польшчы лік беспрацоўных да яшчэ працуючых выяўляецца ў 72 проц., дык на Зах. Беларусі—147 проц.).

Аб дэградацыі народнай гаспадаркі Заходняй Беларусі, аб рэжім відавочным заняпадзе ўсіх галін жыцьця краю сьведчаць хоць-бы гэтыя некалькі лічбаў: у даваенны час на ЗБ тэкстыльных рабочых налічвалася каля 10.000 чалавек; у 1929 г. іх налічваецца ўжо толькі 6.000, а за гэтыя паўтары гады шагнуўшаючагася крызісу і гэтая лічба зьменшылася прыблізна на палову. Гарбарная прамысловасьць у Віленшчыне ў параўнаньні з даваенным часам скарацілася на 87 проц.; у Беласточчыне—на 73 проц. Тое-ж самае з тытунёвай прамысловасьцю—на фабрыцы Шэрашэўскага ў 1924 г. працавала 1.800 чалавек, цяпер—600—700.

Вёска задыхаецца ад падаткаў, безь зямельля, беспрацоўя і голаду. Урад зьдзірае апошняе дабро на падрыхтоўку вайны супроць СССР. Згодна паведамленьня «Дзеньніка Віленскага» за адзін тыдзень тэтага месяца было зроблена звыш 500 падатковых ліцытацыяў на Віленшчыне і гэта летам у так сказаць несэзонны час. Пакупецкая здольнасьць сялянства па афіцыйных дадзеных пала ў параўнаньні з мінулым годам на 25 проц.

Побач з тым завастрасецца нацыянальны ўціск і праводзіцца гвалтоўная палёнізацыя краю. Нядаўна зачынена беларуская гімназія ў Клецку, яўрэйская сэмінарыя ў Вільні, задушана рабоча-сялянская беларуская праса, і прасьледуюцца беларускія школы.

Беларускія буржуазія і яе нацыянал фашысты прадаюць інтарэсы беларускага народу, яны ў саюзе і пад камандай польскага фашызму намагаюць граміць рэвалюцыйную нацыянальна-вызвольную барацьбу працоўных мас супроць імпэрыялістычнай акупацыі, супроць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску. Бачачы нямінучую магілу ка піталістычных астаткаў у БССР і прыціскаными рэвалюцыйным рухам у ЗБ, беларуская буржуазія і нацыянал-фашысты шукаюць ратунку і апекі ў польскага імпэрыялізму і разам з ім рыхтуюць новы крывавы паход на Савецкі Саюз.

11-га ліпеня—дата вызваленьня Савецкай Беларускі—усё яскравей гарыць шуцьводнай зоркай для працоўных Заходняй Беларусі. Пераймаючы рэвалюцыйны прыклад пралетарыяту Варшавы, Шлёнску, Дамброва, працоўныя масы Зах. Беларусі ўсё цьвярдзей становяцца на шлях пралетарскай рэвалюцыі. Кожны дзень прыносіць баявыя бадзёрыя весткі з фронту барацьбы рабочых і сялян ЗБ. Контр-наступленьне працоўных мас пад кіраўніцтвам кампартыі разгорваецца на ўсіх вучастках. Сыстэматычныя выступленьні беспрацоўных у Вільні ўжо на працягу некалькіх месяцаў, якія з кожным разам набываюць больш востры масавы характар, забастовачная хваля тэкстыльшчыкаў, гутнікаў, цагельнікаў, краўцоў, масавы адпор сялян падаткоўым экзэкуцыям і зямельнай палітыцы ўраду, бунты ў войску, палпалы маёнткаў і кулацкіх асадніцкіх сядзіб—вось рэвалюцыйная хроніка акупаванай Заходняй Беларусі.

Сьвяткуючы 11-ую гадавіну свайго вызваленьня, працоўныя масы БССР, яшчэ мацней пралетарскае прывітаньне, выяўляюць палітычную салідарнасьць рабочым і сялянам Заходняй Беларусі—змагаром за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

Адначасна мы павінны ўсямерна ўзмоцніць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, узмоцніць абароназдольнасьць свайго краю. Бо вораг ня дрэмле, выбуховы матар'ял у капіталістычным лягеры награмаджаецца бадай з кожным днём. «Лекі» Гувэра яшчэ больш завастраюць капіталістычныя супярэчнасьці, гэтыя «лекі» вастрыём сваім накіраваны супроць СССР.

Кожны новы завод, новы калгас, новая школа—гэта крапасьць супроць інтэрвэнцыі, а на той бок мяжы—гэта новая зарадка натхненьня ў барацьбе працоўных мас супроць капіталістычнай эксплёатацыі, супроць фашысцкай акупацыі.

Наперад, па шляху да сацыялізму!

Адозва прэзыдыуму Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР

да дня вызваленьня БССР ад белапалякаў

11 год назад, выконваючы волю паўстаўшых рабочых і працоўнага сялянства, Чырвоная армія пры актыўным падтрыманьні працоўных усіх нацыянальнасьцяй, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і братэрскай дапамозе рабочае клясы ўсяго Савецкага Саюзу, вызваліла Беларусь ад акупацыі белапанскай Польшчы.

11-га ліпеня 1920 г. над сталіцай БССР—Менскам узьвіўся пераможны чырвоны сьцяг.

Народжаная ў агні Кастрычніцкай рэвалюцыі, савецкая ўлада на аснове ленінскай нацпалітыкі, вырашыла нацыянальнае пытаньне, даўшы поўную магчымасьць працоўным усіх нацыянальнасьцяй, прыгнечаным у мінулым, будаваць сваю сацыялістычную дзяржаву.

У пэрыяд гераічнай барацьбы краіны пралетарскай дыктатуры белапольскія банды, пры актыўнай дапамозе міжнароднага імпэрыялізму, пад сьцягам выратаваньня «культуры» і «цывілізацыі» акупавалі Савецкую Сацыялістычную Беларусь.

Акупанты ратавалі «цывілізацыяю», запаўняючы турмы рабочымі і працоўнымі сялянамі ўсіх нацыянальнасьцяй, караючы сьмерцю лепшых пралетараў гораду і вёскі, адданых справе пралетарскай рэвалюцыі, руйнуючы і паляючы вёскі, заводы і фабрыкі, гвалтуючы жанчын і рабуючы працоўнае насельніцтва.

У часе акупацыі белапольская зграя далёка пакінула ззаду засьценкі царскіх апрычнікаў. Тысячы лепшых барацьбітоў рабочае клясы былі расстраляны і закатаваны. Панскі бізун дзіка разгуліваў на сьпінах рабочых і сялян. Белапольская акупацыя прыдушыла эканамічнае і культурнае жыцьцё працоўных на акупаваных абшарах Савецкай Беларусі. Апіраючыся на кулака і абшарніка, фабрыканта і нэпмана, на рэлігійных служак розных веравызнаньняў і іншыя клясава-варожыя элемэнты, белапольская банда імкнулася зруйнаваць Савецкую Сацыялістычную Беларусь, аднавіць уладу абшарнікаў і капіталістаў, ператварыць БССР у калёнію польскага імпэрыялізму.

Настаў цяжкі, крывавы закаваны ў ланцугі сацыяльнага і нацыянальнага ўціску час для рабочай клясы і працоўнага насельніцтва ўсіх нацыянальнасьцяй акупаванай Беларусі. Рабочая кляса і ўсе працоўныя на аснове клясавай сьвядомасьці і бязьмежнай адданьці справе абароны краіны саветаў узяліся за зброю, каб даць руйнуючы адпор белапольскім акупантам. Пры братэрскай дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу рабочая кляса і ўсё працоўныя БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вызвалілі Савецкую Беларусь ад акупацыі белапанскай Польшчы.

Мы атрымалі ў спадчыну ад акупантаў руіны гарадоў, мястэчак і вёсак, тысячы інвалідаў, вогнішчы зруйнаваных вёсак, заводаў і фабрык. Усё тое, што ня было зьнішчана імпэрыялістычнай вайной, было ўшчэнт зруйнавана акупантамі і белапольскай шляхтай.

Апіраючыся на гераічную дапамогу ўсяго Савецкага Саюзу, рабочая кляса і ўсё працоўныя пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі бальшавікоў з вялізарным энтузіязмам, з вялізарным гераізмам пачалі адбудоўваць вызваленую Савецкую Сацыялістычную Беларусь. Суседнія імпэрыялістычныя драпежнікі не шкадавалі сіл, каб сарваць мірнае будаўніцтва БССР. На тэрыторыю Савецкай Беларусі былі кінуты дывэрсыйныя банды, якія імкнуліся працягваць крывавую контр-рэвалюцыйную справу белапольскіх акупантаў.

Белапольскія бандыты і іх непасрэдны натхняцель і кіраўнік—міжнародны імпэрыялізм пралічыліся. Перамагла непахісная воля рабочых і сялян краіны дыктатуры пралетарыяту змагацца за перамогу справы сацыялізму. Рабочая кляса і ўсе працоўныя Савецкай Беларусі залячылі раны, нанесеныя акупантамі, ліквідавалі голад і адбудавалі гарады і мястэчкі, шляхі і вёскі, фабрыкі і заводы.

Цяжкая спадчына пакінутая белапольскімі акупантамі была ліквідавана гераічнымі намаганьнямі ўсёй рабочай клясы і працоўных усіх нацыянальнасьцяй пры дапамозе Савецкага Саюзу пад бальшавіцкім кіраўніцтвам партыі Леніна. Дзякуючы найвялікшай дапамозе Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік БССР, вызваленая ад уціску белапольскіх акупантаў, стала на шлях пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва. Разгортваючы пасьлядоўнае сацыялістычнае наступленьне, пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе Цэнтральнага Камітэту, БССР ператвараецца з раней адсталай, прыгнечанай калёніяльнай палітыкай царызму ў рэспубліку індустрыяльных гігантаў, магутных электрастанцый, буйных саўгасаў, калгасаў і машына-трактарных станцый.

У БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе ліквідавана беспрацоўе. Гіганцкімі тэмпамі расьце творчы ўздым і працоўны энтузіязм найшырэйшых рабочых, калгасных і аднаасобных бядняцка-сераднякіх мас. З посьпехам ажыцьцяўляецца пяцігодка за чатыры гады. Перадавыя раёны БССР завяршаюць у асноўным суцэльную калектывізацыю і на яе аснове ліквідацыю кулацтва як клясы,—гэтага апошняга аплоту міжнародный контр-рэвалюцыі.

Гістарычных перамог сацыялістычнага будаўніцтва мы здолелі дасягнуць ва ўшчэнт разбураным белапольскімі акупантамі краіне, толькі пры дыктатуры пралетарыяту і пад сталёвым ленінскім кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Да 11-ці годзьдзя вызваленьня БССР мы дасягнулі такіх тэмпаў індустрыялізацыі—«гэтай адзінай базы сацыялізму» (Ленін), якіх ня ведае ні адна капіталістычная краіна. Нябывалы твор чы ўздым рабочае клясы выяўляецца ў сапраўдных сацыялістычных мэтадах працы,—саспаборніцтве і ўдарніцтве, якія прасякнулі ўсё жыцьцё, усю работу нашых заводаў і фабрык, саўгасаў, калгасаў, машына-трактарных станцый. На аснове бальшавіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі і нячуванага ўздыму ўсёй народнай гаспадаркі з году ў год значна паляпшаецца матар'яльнае і культурнае становішча рабочай клясы і ўсіх працоўных. Пасьпяхова ажыцьцяўляецца перавод прадпрыемстваў на 7 гадзінны працоўны дзень. Пераважная большасьць прадпрыемстваў пераведзена на бесьперапынку. Шпарка расьце жыльлёвае будаўніцтва.

На аснове індустрыялізацыі мы дасягнулі гістарычных перамог у справе сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Да 11-ці годзьдзя вызваленьня БССР ад белапольскай акупацыі звыш 40% бядняцка-сераднякіх гаспадарак зруйнавалі межы сваіх індывідуальных палосак і аб'ядналіся ў калектывы. На вызваленых палёх Беларусі тысячы трактараў пераворваюць межы індывідуальных палосак у калектыўныя барозны.

Няўхільна расьце культурны і гаспадарчы ўздым працоўных нацыянальных меншасьцяй. Пад кіраўніцтвам партыі працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй будуюць нацыянальную культуру, сацыялістычную па сваім зьмесьце. Працоўныя нацменшасьцяй, асабліва яўрэйская беднота, якая стагодзьдзямі цярпела ня чуваны ўціск ад царызму, уцягваюцца ў карысна - вытворчую працу.

БССР ператвараецца ў краіну суцэльнай пісьменнасьці. Уведзена ўсеагульнае навучаньне. За 11 год існаваньня БССР, пры дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу арганізаваны дзесяткі новых ВНУ і навукова-дасьледчых устаноў, нацыянальныя тэатры, тэхнічныя і прафэсыянальныя школы і г. д. Бесьперапынна развіваецца беларуская культура і культура нацменшасьцяй, расьце друк, растуць газэты на мовах нацменшасьцяй. Усё гэта—лепшы паказальнік правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня на аснове ленінскай нацпалітыкі.

Сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі і ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, выклікаюць шалёнае супраціўленьне клясавага ворага.

Па загаду францускага імпэрыялізму і польскага фашызму, пры актыўным падтрыманьні міжнароднага капіталу, беларуская контр-рэвалюцыйная нацдэмакратычная група і шкоднікі, як у БССР, так і ў Савецкім Саюзе, імкнуліся сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, падрыхтаваць глебу для імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі, заталіць у крыві рэспубліку рабочых і сялян.

Шалёныя спробы міжнароднай контр рэвалюцыі сарваць пераможнае будаўніцтва сацыялізму ў краіне дыктатуры пралетарыяту ня здолелі спыніць жалезных крокаў пяцігодкі, якая з посьпехам ажыцьцяўляецца за чатыры гады і нават у некаторых галінах народнае гаспадаркі—за 2 з паловай гады.

Сьвяткуючы 11-годзьдзе вызваленьня Беларусі, ад белапалякаў, рабочыя, калгасьнікі, батракі, беднякі і сераднякі ніколі не забудуць гераічнай барацьбы Чырвонай арміі, ніколі не забудуць змагароў за справу рабочае клясы, якія загінулі ў самаадданай барацьбе супроць белапольскай акупацыі.

Рабочыя, калгасныя і аднаасобныя бядняцка-сераднякіія масы цьвёрда памятаюць, што БССР знаходзіцца на мяжы з капіталістычным сьветам, што БССР—фарпост Савецкага Саюзу.

На фронце ўзрастаючага развалу капіталістычнага сьвету, які задыхаецца ў ціскох найглыбейшага эканамічнага крызісу, Савецкі Саюз і яго неадлучная частка—БССР—завяршаюць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Гэта выклікае шалённую падрыхтоўку анты-савецкай вайны з боку імпэрыялістычных дзяржаў. Як ніколі ўзрасла ваенная небясьпека.

Змагаючыся за ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады, мы павінны няўхільна ўзмацняць абароназдольнасьць краіны саветаў.

На варце заваёў Кастрычнікавай рэвалюцыі стаіць Чырвоная армія, якая ў любую хвіліну гатова даць руйнуючы адпор імпэрыялістычным драпежнікам.

Пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, рабочая кляса і працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй пры брацкай дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу, яшчэ больш узмоцняць абароназдольнасьць нашай краіны і з посьпехам завяршаць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі, выканаюць пяцігодку за чатыры гады.

1. За яшчэ больш высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва!

2. За непахіснае змаганьне па ажыцьцяўленьні задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі!

3. За ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР і яго неадрыўнай часткі—БССР!

4. Няхай жыве ленінская партыя бальшавікоў і яе правадыр т. Сталін!

5. Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

Час. вык. аб. старшыні ЦВК БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

За сакратара ЦВК БССР
Б. ВАНСОЎСКІ.

10-VII—31 г. Менск.

Вышэйшая школа на службу сацыялістычнаму будаўніцтву

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у дзень дзесяцігодзьдзя Бел. Дзярж. Унівэрсытэту шле свае бальшавіцкае прывітаньне навукова-выкладчыцкаму, студэнцкаму і адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналю.

ЦК улічвае магутную ролю сыграную Бел. Дзярж. Унівэрсытэтам, як першай вышэйшай школай і першым навукова-дасьледчым цэнтрам Савецкай Беларусі ў справе разьвіцьця беларускай пралетрскай культуры. У пэрыяд шырока разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва на беларускія вузы падае адказная задача па падрыхтоўцы кваліфіцыраваных кадраў спэцыялістых, здольных стаць камандырамі сацыялістычнай прамысловасьці, дастаткова ўзброенных марксыцка-ленінскай мэтодолёгіяй.

Цэнтральны Камітэт упэўнен, што пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі, пры напружанай працы ўсіх адданых сацыялістычнаму будаўніцтву, навуковых працаўнікоў і пралетарскага студэнцтва Вузы БССР з гэтымі задачамі справяцца.

Партыя чакае ад працаўнікоў БДУ ўзмацненьня барацьбы з усімі праявамі клясава-варожай ідэолёгіі, з вялікадзяржаўным шовінізмам, прадстаўляемым на даным этапе галоўную небясьпеку, з контрэволюцыйным нацдэмакратызмам і шовінізмам розных колераў.

Няхай жыве Вышэйшая школа на службу сацыялістычнаму будаўніцтву.

Няхай жыве маркса-ленінская навука, дапамагаючая рабочай клясе ажыцьцяўляць свае гістарычныя перамогі.

ЦК КП(б)Б.

Бальшавіцкая „Правда"—усебеларускаму зьезду рабселькораў

Рэдакцыя «Правды» шле бальшавіцкае прывітаньне ўсебеларускаму зьезду рабселькораў—зьезду «камандзіраў пралетарскай грамадзкай думкі».

Той факт, што ваш зьезд зьбіраецца ў пачатку другога паўгодзьдзя і трэцяга кварталу рашаючага году пяцігодкі, ускладае на яго работу вялізарную адказнасьць. Зьезд павінен мабілізаваць—праз рабселькораў і нізавы друк, — мільённыя масы пралетараў і калгасьнікаў Савецкай Беларусі на бязумоўнае выкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, даўшы руйнуючы адпор усім клясавым ворагам правай і «левай» агентуры і каляпартыйным абываталям, якія ня верань у рэальнасьць нашых пляноў.

Для сапраўднай барацьбы за бальшавіцкія пляны рабселькораўскі рух Беларусі павінен развівацца пад сьцягам ударніцтва ў друку, перабудовы рабселькораўскага руху і далейшай дыфэрэнцыяцыі задач рабселькораў на аснове пастановы ЦК УсеКП(б), прамовы тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў і пастановы ЦК КП(б)Б.

Больш увагі нацыянальна-культурнаму будаўніцтву Савецкай Беларусі і абароне яе межаў.

Яшчэ шырэй разгортваць сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце.

«ПРАВДА».

Рабселькоры, пад кіраўніцтвам партыі—барацьбіты за пабудову сацыялізму

Для замацаваньня дасягнутых посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, для рашучага павароту саветаў і выканаўчых камітэтаў тварам да вытворчасьці і калгаснага руху, для рашучай і хутчэйшай перабудовы работы саветаў у адпаведнасьці з асноўнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва неабходна, як гэта выразна падкрэсьліў Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК Усе КП(б): узмацненьне ролі саветаў, як праваднікоў генэральнай лініі партыі, непрымірымых барацьбітоў супроць правага і «левага» апартунізму; карэннае паляпшэньне самога складу саветаў; узмацненьне апоры саветаў на «новы масавы актыў і раней за ўсё на ўдарнікаў фабрык і заводаў»; уцягненьне «новых мільёнаў рабочых і сялян у рады актыўных будаўнікоў сацыялізму», далейшае разьвіцьцё савецкай дэмакратыі ня толькі па лініі кантролю «рабочых і сялян зьнізу над работай дзяржапарату», але і па лініі разьвіцьця «новых форм дабраахвотнага ўдзелу рабочых у выкананьні дзяржаўнай работы» і на гэтай падставе, карыстаючыся разгорнутай крытыкай і самакрытыкай, яшчэ больш рашучае і настойлівае разгортваньне барацьбы з бюракратызмам і «забясьпечаньне сапраўднай праверкі выкананьня прынятых партыяй і савецкай уладай пастаноў».

Гэтыя асноўныя баявыя задачы, якія прад намі высунула партыя, зьяўляюцца выразнай праграмай дзейнасьці рабселькораў у іх барацьбе за палепшаньне работы саветаў, за рашучую перабудову іх работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі, за палепшаньне і пасьпяховае разгортваньне масавай работы саветаў, за ачыстку саветаў ад варожых і чужых элемэнтаў, за работу саветаў, накіраваную на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Рабселькоры—«камандзіры пролетарскай грамадзкай думкі»!

Вы актыўныя барацьбіты за сацыялізм. Вы ўжо шмат зрабілі для палепшаньня работы саветаў. Ваш вопыт і практыку, вашы здольнасьці і пралетарскую крытыку і самакрытыку яшчэ больш завастрыце на рабоце саветаў і выканкомаў. Выкрывайце усе недахопы ў рабоце саветаў, паказвайце ўсе станоўчыя бакі і дасягненьні, дапамагайце ў рабоце саветаў, салдэйнічайце перанясеньню лепшага вопыту лепшых саветаў у больш адсталыя саветы. Змагайцеся з бюракратызмам, цяганінай, няўважлівымі адносінамі да інтарэсаў працоўных мас. Змагайцеся за поўнае ажыцьцяўленьне саветамі і выканкомамі ўсіх задач пастаўленых партыяй і савецкай уладай, за зьнішчэньне ўсіх перашкод, што стаяць на шляху пабудовы сацыялізму. Разгортвайце вялікую арганізацыйную, апэрацыйна-масавую работу па асваеньні ўсіх канкрэтных задач пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

Мабілізуйце шырокія рабочыя, калгасныя і працоўныя масы на барацьбу, пад кіраўніцтвам партыі, за пляны 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Змагайцеся за прыкладнасьць саветаў і выканкомаў у выкананьні ўсіх задач, што стаяць перад імі, за іх прыкладнасьць у пашырэньні форм масавай работы, па ўцягненьні ўсіх працоўных у сацыялістычнае будаўніцтва.

Гэтыя асноўныя задачы і абавязкі ўскладае ЦВК БССР на рабселькораў і іх лепшых прадстаўнікоў дэлегатаў Усебеларускага зьезду.

Ад імя ЦВК шчыра вітаю другі Ўсебеларускі зьезд рабселькораў.

Вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

10-га ліпеня 1931 г. г. Менск.

Ударнікам пралетарскага друку—баявое, камсамольскае

ЦК ЛКСМБ ад імя 130000 арміі ленінскага камсамолу Беларусі шле II ўсебеларускаму зьезду рабселькораў баявое камсамольскае прывітаньне.

Зьезд сабраўся ў пэрыяд нячуваных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, пры нябывалым узросьце энтузіязму працоўных мас у барацьбе за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за выкананьне генэральнай лініі партыі, у якой агромністую ролю адыгрывае друк, як самая моцная зброя, калектыўны арганізатар у руках пралетарыяту.

Ленінскі камсамол—ударная брыгада сацыялістычнага будаўніцтва, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, непрымірыма змагаецца за бальшавіцкія тэмпы работы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, і на аснове разгортваньня самакрытыкі выкрывае недахопы, якія перашкаджаюць пераможнаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

ЦК спадзяецца, што зьезд з посьпехам прапрацуе ўсе пытаньні, стаячыя на абвестцы дня і яшчэ больш мабілізуе рабселькораў і ўсіх працоўных на завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік і арганізатар усяго пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве шматтысячная армія рабселькораў—актыўных змагароў за генэральную лінію партыі!

Лепшыя рабкоры-ўдарнікі—у партыю Леніна

У бюро партаклектыву зав. „Бальшавік" заява

Мы, ударнікі Чырвонаштандарнага Скурзаводу «Бальшавік»—непасрэдныя ўдзельнікі пераможнай барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі, падыходзячы да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў з вялікімі посьпехамі ў гэтай барацьбе, просім прыняць нас у шэрагі ленінскай камуністычнай партыі, каб прыняць яшчэ больш актыўны ўдзел у будаўніцтве сацыялізму ў нашай краіне, каб сумесна з усёй ленінскай партыяй скарыстоўваць крытыку і самакрытыку на зьнішчэньне недахопаў у нашай партыі, аддаючы ўсю эпэргію для далейшай пасьпяховай барацьбы, зьмятаючы з свайго шляху правых апартуністаў, як галоўную небясьпеку на даным этапе і «левых» фразёраў справабучых перашкаджаць нам пасьпяхова будаваць сацыялізм.

1. Рубенчык Ш. вытв. стаж 22 г. 2. Фрыц 20 г. 3. Ружэвіч 12 г. 4. Капелевіч 10 г. 5. Левін 8 г. 6. Шаліма 7 г. 7. Жэўжык 6 г. 8. Марошак 4 г. 9. Фішкін 3 г. 10. Міхуноў—цеплатэхнік заводу.

Інфармацыю аб адчыненьні зьезду рабселькораў чыт. на 2 стар.

Толькі на аснове ажыцьцяўленьня ленінскай нацпалітыкі магчыма разьвіцьцё вышэйшай асьветы ў БССР

10-ці годзьдзе вышэйшай школы БССР — гэта помнік ленінскага вырашэньня нацыянальнага пытаньня! Там, ва кардонам, гэта пытаньне, як балючая рана на капіталістычным целе, усе больш і больш гноіцца і як гангрэна зьнішчае цэлы капіталістычны арганізм, у Савецкім Саюзе няма пануючай нацыянальнасьці, няма прыгнечаных нацыянальнасьцяй. Усе працоўныя, бяз розьніцы нацыянальнасьці, карыстаюцца аднастайнымі правамі. Усе нацыянальнасьці маюць таксама магчымасьці для разьвіцьця сваёй культуры. У Савецкім Саюзе Савецкая Беларусь з дня на дзень усё больш і больш індустрыялізуецца, узьнімаючы сваю зямляробчую тэхніку, будуючы сельскую гаспадарку на калектыўных падставах, узьнімаючы мільёны людзей на вышэйшы ўзровень культуры. Прамені асьветы зьнішчаюць змрок. Вышэйшая школа з году ў год стварае новыя рады асьветнікаў і людзей ведаў.

Дазвольце хоць здалёку прывітаць вас і пажадаць, каб вышэйшая школа БССР як надалей і найшырэй сьвяціла і ўсё больш рабілася тым, чым яна павінна быць і ёсьць—штабам сацыялістычнай культуры.

ФЭЛІКС КОН.

Няхай жыве Чырвоная армія--слаўны вартавы савецкіх межаў!

БССР была, ёсьць і будзе верным фарпостам Савецкага Саюзу на рубяжы з капіталістычным сьветам

М. Гнілякевіч

АДЗІНАЦЦАЦЬ ГОД ЗМАГАНЬНЯ ЗА ЛЕНІНСКУЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПАЛІТЫКУ У БССР

11 ліпеня 1920 г. зьяўляецца канцом адной з самых сумных старонак гісторыі існаваньня нашай рэспублікі, канцом прыгнечаньня працоўных мас, заняпаду і разбурэньня народнай гаспадаркі і пачаткам вольнага жыцьця працоўных усіх нацыянальнасьцяй, што жывуць на тэрыторыі БССР, пачаткам аднаўленьня і ня чуванага палітычнага, эканамічнага, і культурнага росквіту Беларускай ССР.

Савецкая Беларусь за адзінаццаць год існаваньня прайшла гігантцкі гераічны шлях, шлях ад кабалы абшарнікаў, капіталістычнай эксплёатацыі і нацыянальнага рабства да завяршэньня пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

Аднавіўшы народную гаспадарку, разбураную імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайной, акупацыямі і бандытызмам, працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй Савецкай Беларусі перайшлі да сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі. Згуртаваныя навакол Камуністычнай партыі працоўныя БССР з энтузіязмам і вялікім гэраізмам, ужываючы мэтады сацыялістычнай працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва,—пасьпяхова ажыцьцяўляюць індустрыялізацыю краіны, калектывізацыю сельскай гаспадаркі.

Шпаркія і ўсё нарастаючыя тэмпы індустрыялізацыі БССР стваравоць моцную эканамічную аснову для ліквідацыі сьлядоў фактычнай няроўнасьці—спадчыны нацыянальнай палітыкі царызму. На аснове індустрыялізацыі значна ўзрасла колькасьць пралетарыяту. Адначасова з ростам буйнай прамысловасьці ўзрасла і разьвілася кааперацыйная саматужная прамысловасьць як у горадзе, так і ў мястэчку і на вёсцы. Ліквідавана беспрацоўе.

Адначасова з ростам пралетарыяту БССР значна расьце і дабрабыт працоўных мас.

Ператварыўся і твар вёскі. Месца прымітыўнага земляробства усё больш і больш займае прадукцыйная калектывізаваная гаспадарка, якая ў сучасны момант ужо ахапіла 40 з лішнім процантаў усіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Калі-ж да гэтага дадаць, што рост прамысловасьці БССР перавышае агульны рост прамысловасьці па Саюзе ССР (169,1 проц. у БССР супроць 124 проц. па Саюзе ССР), дык стане зусім зразумелым, што правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня, якое заключаецца ў тым, «каб зьнішчыць тую адсталасьць (гаспадарчую, палітычную і культурную) нацыянальнасьцяй, якую яны атрымалі ў спадчыну ад мінулага, каб даць адсталым народам магчымасьць дагнаць цэнтральную Расію ў дзяржаўных, культурных і гаспадарчых адносінах» (СТАЛІН)—стала ў нас рэальнай сапраўднасьцю.

Мы маем таксама вялізарнейшыя дасягненьні ў справе будаўніцтва сацыялістычнай нацыянальнай культуры. Савецкая Беларусь зьяўляецца ПЕРШАЙ з усіх рэспублік Савецкага Саюзу, якая ўвяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне. Мы ахапілі школамі каля 97 проц. дзяцей узросту ад 8 да 10 год. Мы ўвялі абавязковую ліквідацыю няпісьменнасьці працоўных БССР да 45 гадовага ўзросту. Толькі за апошнія два гады ліквідавана ахоплена каля 700.000 чалавек дарослага працоўнага насельніцтва.

Вялізарныя посьпехі мы маем таксама ў справе разьвіцьця самай адсталай у мінулым галіны культурнага будаўніцтва—сярэдняй і вышэйшай прафэсыянальнай асьветы: мы на сёньняшні дзень маем 65 тэхнікумаў і 20 школ фабзавучу, вышэйшых навучальных устаноў мы маем 13, рабфакаў 24.

Мы маем нябывалы рост выдавецкай справы. Адным Белдзяржвыдавецтвам выдадзена ў 1929-30 годзе 1815 розных назваў кніжак; часопісаў у Савецкай Беларусі ёсьць 20, газэт цэнтральных—14 (з іх 6 на нацмовах) і раённых—32.

Нашы дасягненьні ў галіне будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу характарызуюцца ня толькі вышэйадзначанымі колькаснымі паказчыкамі,—значныя посьпехі мы маем таксама па лініі якаснага паляпшаньня нашай культурнай справы. Так, напрыклад, значна вырасла рабочая праслойка ва ўсіх нашых навучальных установах, асабліва ў рабфаках. Закладзена значная база па падрыхтоўцы пралетарскіх навуковых кадраў: у сучасны момант розными навучальнымі і навуковымі ўстановамі падрыхтоўваюцца 260 асьпірантаў—выхадцаў з рабочых і працоўных сялянскіх мас. Разам з гэтым шырока мабілізавана марксыцка-навуковая грамадзкасьць на змаганьне з уплывамі буржуазных тэорый у розных галінах навукі.

На фоне агульнага росту эканамічнага і культурнага разьвіцьця краіны мы маем значныя посьпехі ў справе ўздыму эканамічнага і культурнага добрабыту нацменшасьцяй, якія насяляюць БССР, у справе ўцягненьня рабочых і працоўных нацменшасьцяй ў сацыялістычнае будаўніцтва.

Савецкая ўлада няўхільна і пасьлядоўна праводзячы ў жыцьцё, пастаўленую спачатку існаваньня БССР задачу ажыцьцяўленьня фактычнага раўнапраўя працоўных усіх нацыянальнасьцяй, асабліва ўвагу надае ўздыму гаспадарчага і культурнага становішча працоўных яўрэяў.

З усіх нацыянальнасьцяй Беларусі больш за ўсё прыгнечаньня і гвалту цярпела пры царскім ўрадзе яўрэйская нацыянальнасьць. Шырокія працоўныя яўрэйскія масы царскай палітыкай былі загнаны ў эканамічны тупік. Пры гэтым трэба падкрэсьліць, што яўрэйскае насельніцтва па колькасьці займае ПЕРШАЕ месца сярод нацменшасьцяй у БССР. Да ўсяго насельніцтва БССР яно складае 8,19 проц., а да гарадзкога—40,12 проц.

Вось чаму партыя і савецкая ўлада ўдзяляла і ўдзяляе асаблівую ўвагу абслугоўваньню працоўных яўрэяў. Зараз, дзякуючы шпаркаму тэмпу разьвіцьця нашай прамысловасьці і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі з аднаго боку і з другога асобным мерапрыемствам, якія ажыцьцяўляюцца кампартыяй і савецкім урадам па эканамічным упараджаваньні працоўных яўрэйскага насельніцтва, гэты «тупік» зьнішчаецца і вастрата «яўрэйскага пытаньня» паступова адпадае.

За апошнія часы значная колькасьць яўрэйскай працоўнай беднаты ўцягнута ў прамысловасьць. Каля 3 тысяч сямей яўрэйскай беднаты ўпараджавана па лініі самрамкаапэрацыі. Колькасьць яўрэйскіх сямей, аб'яднаных у калгасы ў апошнія паўтара гады ўзрасла больш чым у 2 разы—з 2.145 сямей у сярэдзіне 1929 году да 4.862 у канцы 1930 году. Большасьць некваліфікаванай часткі яўрэйскай беднаты ўцягнута ў вытворчую работу па лініі шляхбудаўніцтва, лесараспрацовак.

Значнае палепшаньне эканамічнага становішча працоўнага яўрэйскага насельніцтва і мяркуемыя ўрадам Савецкай Беларусі далейшыя мерапрыемствы даюць нам поўную упэўненасьць, што і ў далейшым дырэктывы партыі па вырашэньні месцачковай праблемы будуць пасьпяхова ажыцьцяўлены.

Вялізарныя дасягненьні мы можам адзначыць таксама і ў адносінах да іншых нацыянальнасьцяй, як напрыклад: польскае сельскае працоўнае насельніцтва на 20-е мая г. г. ахоплена калектывізацыяй на 60 проц., пры чым некаторыя нацыянальныя польскія саветы, як Лозінскі і Аляксандраўскі калектывізаваны на 100 проц. Бядняцка-сераднякіская гаспадаркі латыскага насельніцтва калектывізаваны ў сярэднім да 54 проц. і літоўскага прыблізна столькі-ж. Гаспадаркі-ж татарскага насельніцтва ў мясцох кампактнага яго засяленьня калектывізаваны звыш як на 60 проц.

Культурнае разьвіцьцё нацменшасьцяй БССР на роднай мове адбываецца з няменшымі тэмпамі, чым агульна-культурнае будаўніцтва краіны.

Разам з ростам агульнай сеткі школ значна расьце таксама сетка яўрэйскіх, польскіх, літоўскіх, латыскіх і украінскіх школ, існуюць яўрэйскія і польскія тэхнікумы, яўрэйскі, польскі, літоўскі і латыскі сэктары пры БАН. Павялічваецца сетка нацыянальных хат-чытален і чырвоных куткоў, арганізаван яўрэйскае і польскае аддзяленьні рабфаку, ўтвораны 2 яўрэйскіх і 1 польскі тэатры і яўрэйская дзяржаўная капэла. Асабліва буйна вырасла выдавецкая справа на нацмовах: за 1930 г. выдана Беларускім аддзяленьнем Цэнтравыдату каля паўмільёна экзэмпляраў розных кніг на нацмовах.

У мэтах утварэньня неабходных умоў для падвышэньня культурна-эканамічнага ўзроўню працоўных мас усіх нацменшасьцяй і ўцягненьня іх у сацыялістычнае будаўніцтва ўсім нацменшасьцям забясьпечана права звароту ва ўсе ўстановы і арганізацыі на іх роднай мове, а ў мясцох з кампактным насельніцтвам тэй ці іншай нацменшасьці арганізаваны нацыянальныя саветы і суды, у якіх усё справаводзтва вядзецца на роднай мове. Зараз ёсьць у БССР яўрэйскія, польскія, расійскія, латыскія, літоўскія, украінскія і нямецкія нацсаветы—а ўсяго 74; міжраённых нацыянальных народных судоў ёсьць 13—10 яўрэйскіх, 2 польскіх і 1 латыскі.

У Савецкай Беларусі пасьлядоўна праводзіцца палітыка інтэрнацыяналізацыі прадпрыемстваў. Нацыянальны склад рабочых цэнзавой прамысловасьці ў 1930 г. вызначаўся у наступным: беларусоў—47,3 проц., яўрэяў—37,6 проц., расейцаў—7,8 проц. палякаў—4,8 проц. і іншых 2,5 проц. Па асобных галінах прамысловасьці нацыянальны склад рабочых хістаецца вельмі рэзка. Напрыклад, у папяровай, дрэваапрацоўчай, мэталюргічнай прамысловасьці і па апрацоўцы мінэралаў пераважную колькасьць складаюць беларусы; у паліграфічнай, швейнай, скуранай і абутковай—яўрэі. Пра водзімымі мерамі па інтэрнацыяналізацыі прадпрыемстваў мы дабіліся некаторага павышэньня ўдзельнай вагі беларускіх рабочых, дзе пераважную колькасьць складалі яўрэі і наадварот—яўрэйскіх рабочых там, дзе пераважную колькасьць складалі беларусы, як напрыклад, у органах транспарту, сувязі і г. д.

Усіх гэтых буйных посьпехаў мы дасягнулі дзякуючы ўзмацненьню дыктатуры пралетарыяту, дзякуючы правільнай генэральнай лініі нашай партыі на індустрыялізацыю краіны, на сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, дзякуючы правільнай ленінскай нацыянальнай палітыкі, накіраванай да зьнішчэньня эканамічнай і культурнай няроўнасьці народаў.

Разгортваньне наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, пасьпяховае правядзеньне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыя на базе суцэльнай калектывізацыі кулацтва, як клясы, ўпартая барацьба за завяршэньне пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі ў 1931 г. праходзіць ва ўмовах напружанай клясавай барацьбы.

Рэшткі капіталістычных элемэнтаў і контррэвалюцыйнай буржуазнай інтэлігэнцыі, пры дапамозе замежнай імпэрыялістычнай буржуазіі імкнуліся перашкодзіць ажыцьцяўленьню пяцігодкі ў чатыры гады, імкнуліся распаўсюджыць свой уплыў ня толькі па эканамічнай лініі, але таксама і на ідэолёгічным фронце ва ўсіх галінах культурнага будаўніцтва.

Вялікадзяржаўныя шавіністы, контррэволюцыйныя беларускія нацыяналдэмакраты, нацыяналісты і шавіністы іншых колераў, змагаючыся з дыктатурай пралетарыяту за рэстаўрацыю капіталізму ў БССР, паставілі сваей задачай затармазіць індустрыялізацыю краіны, давесьці нерэальнасьць узятых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і з гэтай прычыны зьнізіць іх, узяць курс на разьвіцьцё ў першую чаргу сельскай гаспадаркі, а потым ужо прамысловасьці, перавесьці БССР на шлях капіталістычнага разьвіцьця, а савецкую культуру зрабіць нацыянальна-буржуазнай па зьместу. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вяла і вядзе бязьлітасна барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, выкрыла твар контррэвалюцыйнага беларускага нацыяналдэмакратызму, выкрыла і разьбіла буржуазныя тэорыі, якія былі накіраваны на змаганьне з дыктатурай пралетарыяту за рэстаўрацыю капіталізму праз сувязь з контррэвалюцыйнымі элемэнтамі ў нашай краіне і з так званымі «беларускімі дзеячамі» буржуазнай фашыстоўскай Польшчы. Камуністычная партыя правяла і праводзіць рашучую барацьбу супроць усіх ухілаў ад ганэральнай лініі партыі, супроць правага ўхілу ў першую чаргу, як найбольш небясьпечнага на даным этапе.

На сёньняшні дзень мы можам, сказаць, што на шляху правільнага ажыцьцяўленьня Ленінскай нацыянальнай палітыкі клясавы вораг разбіты. Але было-б вялікай памылкай, калі-б мы лічылі, што ворагі, перашкаджаючыя правядзеньню і ажыцьцяўленьню Ленінскай нацыянальнай палітыкі, канчаткова дабіты. Нашы ворагі ў справе правядзеньня нацыянальнай палітыкі не склалі сваёй зброі. Прадбачачы блізкую пагібель, яны супраціўляюцца і будуць супраціўляцца з усёй сілай. Але пры максымальным уздыме энтузіязму і рэвалюцыйнай волі рабочых і ўсіх працоўных мас нашай краіны, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, мы канчаткова пераможам клясавага ворага. Вядучы непрымірымую барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, мясцовымі нацыяналізмамі ўсіх колераў, з нацыянал-опортунізмам і прымірэнцтвам да ц—мы забясьпечым у далейшым пасьпяховае ажыцьцяўленьне Ленінскай нацыянальнай палітыкі, накіраванай на эканамічны ўздым і шырокае разьвіцьцё савецкай культуры—нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу.

Сацыялістычная стройка ў БССР ва ўсім разгары. Пяцігодка пасьпяхова выконваецца ў чатыры гады. Замацоўваецца яшчэ больш, на падставе вытворчай змычкі пралетарскага гораду і вёскі, саюз рабочай клясы і асноўных мас сялянства. Пашыраецца калгасны рух, які перарастаець у суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на гэтай базе кулацтва як клясы. Калгаснікі зьяўляюцца сапраўдным апорай партыі і Савецкай улады на вёсцы. Калгаснае сялянства—цэнтральная фігура земляробства.

Усё больш і больш укараняюцца ў масу працоўных сацыялістычныя мэтады работы.

Пад правільным кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і пры падтрыманьні Савецкага Саюзу рабочая кляса Беларускай ССР, перамагаючы цяжкасьці роста і змагаючыся за бальшавіцкія тэмпы рэканструкцыі народнай гаспадаркі краіны, усё бліжэй падыходзіць да канечнай мэты—сацыялізму. Ні шкодніцкая дзейнасьць контррэвалюцыянэраў унутры краіны, ні імкненьні міжнародный буржуазіі да інтэрвэнцыі ня змогуць зьвярнуць з гэтага шляху рабочую клясу БССР і ідучыя за ёй працоўныя масы.

У агні клясавых баёў

Заходняя Беларусь пад ботам польскага фашызму

Заходняя Беларусь стогне пад ярмом польскага фашызму. Руйнуючы крызіс усёй польскай гаспадаркі асабліва востра, з асаблівай сілай праявіўся ў Заходняй Беларусі. Гарбарная прамысловасьць, дрэваапрацоўчая прамысловасьць Заходняй Беларусі вусім спынілі сваю працу. Значна окараціла ся работа на гутах непамерна вялікі процант зруйнаваных, абанкрутаваных дробных майстэрняў шавецкіх і кравецкіх. Беспрацоўе прыняло жудасныя памеры.

Кожны дзень польскі друк паведамляе аб баявых выступленьнях, галодных паходах беспрацоўных, кожны [illegible] паведамляе аб масавых арыштах, аб упартай сутычцы дэманстрантаў, аб забойствах. І сапраўды, на працягу апошняга месяца бадай што ня было ніводнага дня калі-б у Вільні, Беластоку і інш. гарадох Заходняй Беларусі, як і ўсёй Польшчы ня было выступленьня беспрацоўных, ня было заўзятай бойкі з паліцыяй.

Капіталісты—жывадзёры імкнуцца выкарыстаць з юрысу за кошт працоўных мас і вядуць сыстэматычнае зьніжэньне заработку. Калёніяльная палітыка польскага фашызму, люты тэрор спрыяюць прыдушэньню працоўных мас спрыяюць апрабленьню іх фабрыкантамі, памешчыкамі. Пралетарыят і бядняцка - сераднякіская масы сялянства пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі адбіваюць атакі капіталістаў і пераходзяць самі ў контрнаступленьне. За апошні час на абшарах Заходняй Беларусі як і ва ўсёй Польшчы хваля забастовачнага руху прымае ўсё большыя і большыя памеры, а забастоўкі праходзяць усё больш упарта, бо кіраўніцтва забастоўкамі ўсё часьцей ажыцьцяўляецца камуністычнай партыяй.

Так, з 25 чэрвеня забаставалі рабочыя на пабудове чыгункі Дукшта-Друя, якая вызначаецца для вайсковых мэтаў. Бастуючыя дамагаюцца падвышэньня заработку на 30 проц. Такая-ж баявая забастоўка прайшла ў Вільні ў цагельні Міліёўскага. Рабочыя дамагаюцца падвышэньня заработку з 3-х злотых да 4 за 1.000 цэглаў. З 1-га ліпеня бастуюць усе краўцы як жаночых, так і мужчынскіх майстэрняў у Вільні. Бастуюць таксама капялюшнікі. У Беластоку адбыўся мітынг 1.500 тэкстыльшчыкаў, на якім рабочыя выказаліся за абвешчаньне забастоўкі.

Барацьба пралетарыяту і працоўных мас Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі з кожным днём абвастраецца. Зруйнаваныя, даведзеныя да жабрацтва, да поўнай нэндзы, голаду мілітарнай палітыкай польскага фашызму працоўныя масы вядуць упартую барацьбу супроць фашыстскай дыктатуры, дамагаюцца работы і хлеба, вядуць барацьбу за дыктатуру пралетарыяту.

За 11 год панаваньня польскай буржуазіі на Заходняй Беларусі, працоўныя масы зруйнаваны, абадраны, даведзены да канчаткова руіны. Рабочыя ня маюць работы, ня маюць хлеба. Голад, беспрацоўе неадступны спадарожнік на працягу ўсіх год панаваньня буржуазіі.

На вёсцы селянін ня толькі не атрымаў зямлі, але фашыстская «аграрная рэформа» (выдзяленьне на хуторы) адбірае тую зямлю, якой карыстаўся бядняк селянін да гэтага часу. Так, ліквідуюцца сэрвітуты (супольныя пашы) і зямлю ад сэрвітутаў забіраюць абшарнікі. Аграрная палітыка польскага фашызму выразна накіравана на падтрыманьне беларускага кулака, на падтрыманьне асадніка, памешчыка і на зруйнаваньне бедняка і сераднякa.

Масавыя экзэкуцыі, продаж рэчаў за падаткі дасягнулі жахлівых памераў. Запазычанасьць бядняцка-сераднякіх гаспадарак натолькі вялікая, што калі прадаць нават усю яго маёмасьць, дык ня хопіць выплаціць падатковага доўгу, (паасобныя гаспадаркі маюць па 600—700 злотых падатковай запазычанасьці). Зарабіць пабочна няма дзе, ніякай работы, ніякага будаўніцтва апроч некалькіх вастрогаў на Заходняй Беларусі фашыстскі ўрад не праводзіць. Вось чаму ў апошнія гады як сыстэма спагнаньня падаткаў уведзена экзэкуцыя.

Бядняцка-сераднякіская масы сялянства даюць актыўны адпор і часта густа праганяюць падатковых экзэкутараў і паліцыю з лапатамі, з сахарамі з сваіх вёсак. Падамо толькі некалькі фактаў: у вёсцы Насілава Маладэчанскага павету падатковы чыноўнік забраў падушкі, пасьцілкі і інш. хатнія рэчы ў аднаго бедняка селяніна за падаткі. Зараз-жа сабралася ўся вёска за выключэньнем кулакоў. Сяляне ўзброіліся лапатамі, сякерамі і адабралі рэчы, прагналі экзэкутара. На другі дзень прыехаў вялікі атрад коннай паліцыі, аднак і на гэты раз спагнаць падатку ня прышлося ,бо сталі падыходзіць бедняк і сераднякі сяляне іншых вёсак. Уночы паліцыя напала і ўчыніла шматлікія арышты, сярод сялян, якіх падазравала, што яны зьяўляюцца ініцыятарамі самааброны. Аднак, гэта не памагло, бо і на другі і на трэці дзень адпор мас ня зьменшыўся, а наадварот яшчэ пасіліўся.

Такіх фактаў можна падаць дзесяткі тысяч. І што характарна, што самааборона ад фашыстскіх экзэкутараў прымае масавы характар,—салідарныя выступленьні цэлых вёсак.

Гаспадарчы развал, набліжэньне да катастрофы ва ўсёй Польшчы з асаблівай сілай, а асаблівай глыбінёй выяўляецца ў Заходняй Беларусі. Масавая галеча, паўпэрыязацыя, сыстэматычны голад, эпідэміі і павольнае вымираньне вось жніва панаваньня буржуазіі. Рабочая кляса, бядняцка-сераднякіская масы сялянства вядуць упартую барацьбу з фашыстскай дыктатурай і яго агентурай сацыял і нацыянал фашыстамі.

Аб культурных «дасягненьнях» працоўных мас Заходняй Беларусі цяжка напісаць хоць бы слова, бо фактычна такіх дасягненьняў абсалютна няма. Няма ніводнай першапачатковай школы на беларускай мове. Пакінутыя для палітычных махляроў Луцкевічаў, Астроўскіх дзьве беларускія гімназіі ў Клецку і ў Вільні, адна (Клецкая) ужо зачынена, Віленская-ж працягвае яшчэ свае мізэрнае існаваньне. Нацыянал-фашысты Луцкевіч, Астроўскі, Станкевіч, Ярэміч і інш. водкіды, гэтыя агенты польскайахранкі дапамаглі фашыстскаму ўраду разьбіць масавую арганізацыю таварыства Беларускай школы, якое вяло ўпартую барацьбу за здабыцьцё школы для працоўных мас Заходняй Беларусі на роднай мове.

11 год панаваньня буржуазіі «незалежнай» Польшчы на Заходняй Беларусі, 11 год сумеснай дружнай работы беларускай буржуазіі і польскай па падрыхтоўцы вайны, збройнага нападу на СССР, па прыгнечаньні, ўціску і эксплёатацыі працоўных мас Заходняй Беларусі прывялі да поўнага банкруцтва нацыянальнай палітыкі польскай буржуазіі, прывялі да поўнага банкроцтва палітыкі нацыянал-фашыстаў Луцкевічаў—Ярэмічаў. У самых глухіх-мядзьвежых кутках Заходняй Беларусі пабываў штых і бізун паліцыянта гуляючы па сьпінах селяніна бедняка, бізун асадніка, бізун карных экспэдыцый.

11 год гераічнай барацьбы пралетарыяту, гераічнай барацьбы бядняка-сераднякіх мас сялянства пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі Заходняй Беларусі разам з пралетарыятам усёй Польшчы, 11 год нясупыннай барацьбы супроць дыктатуры буржуазіі, за дыктатуру пралетарыяту. Дзесяткі тысяч лепшых адданейшых барацьбітоў за справу рабочае клясы гінуць у астрогах, сотні пабітых, пакалечаных, дзікі разгул белага тэрору, сьвіст нагайкі і звон ланцугоў вечная катарга, катаваньні ў дэфэнзывах, забойствы з-за вугла—ўсё гэта не змагло стрымаць, не змагло задушыць барацьбы працоўных мас за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. У 11-ю гадавіну пралетарыят і працоўныя масы Заходняй Беларусі яшчэ вышэй узьнімуць сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы, яшчэ шчыльней згуртуюць свае рады вакол слаўнай, загартаванай у баёх камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, будуць весьці барацьбу за поўнае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

Рабочая кляса, калгаснікі, усе працоўныя БССР памятаюць часы крывавага бізуна белапанскай акупацыі. За 11 год гераічнай творчай работы працоўныя БССР пры братэрскай дапамозе працоўных СССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ня толькі загаілі раны нанесёныя акупантамі, ня толькі аднавілі зруйнаваныя мястэчкі і гарады, вёскі, а дамагліся вялізарнейшых нябачных немагчымых для капіталістычнага сьвета посьпехаў. З адсталай беднай краіны Савецкая Беларусь гігантскімі крокамі, шпаркімі тэмпамі ператвараецца ў індустрыяльна-калгасную.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у барацьбе на два фронты, супроць правага і «левага» апартунізму, мы дамаглісь вялізарнейшых посьпехаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Новыя фабрыкі і заводы, сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі, стварэньне шырокай сеткі школ на беларускай, яўрэйскай, польскай, расійскай і інш. мовах, стварэньне вышэйшых навучальных устаноў, пабудова ўнівэрсытэту і г. д. цэлая сетка хат-чытальняў, рабочых клюбаў, дамоў адпачынку, усё гэта дасягнута дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ленінскага ЦК, дзякуючы правільнаму правядзеньню ленінскай нацпалітыкі.

Партыя і рабочая кляса нанесьлі рашучы ўдар контррэвалюцыйнаму беларускаму нацыянал-дэмакратызму адсекліі шчупальцы гэтых агентаў польскай ахранкі. І цяпер мы ні на хвіліну не павінны паслабляць барацьбы з рэшткамі контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, узмоцніўшы барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе і з шавінізмамі іншых колераў.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі БССР ідзе наперад да новых перамог да канчатковага завяршэньня пабудовы сацыялізму.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Польшчы і Заходняй Беларусі, пралетарыят і працоўныя масы Польшчы яшчэ вышэй узьнімуць сьцяг барацьбы супроць фашыстскай дыктатуры, голаду і вайны, за дыктатуру пралетарыяту ў абарону СССР.

Л. Г.

На другім усебеларускім зьезьдзе рабочых, сялянскіх і вайсковых карэспандэнтаў

5 гадз. 45 хвілін. Скончыліся дэмонстрацыі рабочых гораду Менску ля Дому камасьветы, дзе а 6-й гадзіне павінен адкрыцца 2-гі ўсебеларускі зьезд рабселькораў.

Заля ня ў стане зьмясьціць і сотай долі тых людзей, якія чакалі 10-га ліпеня—дзень адкрыцьця зьезду.

2-гі ўсебеларускі зьезд рабселькораў ня звычайны зьезд, гэта зьезд прадстаўнікоў армії друку—самай вострай зброі нашай партыі.

Зьезд адкрываў рэдактар ЦО КП(б)Б «Зьвязда» тав. Будзінскі.

— Зьезд зьбіраецца ў такі пэрыяд, калі мы ў краіне, якая будуе сацыялізм, падагульваем вынікі першых 6-ці месяцаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі...

— 2-гі ўсебеларускі зьезд рабселькораў—гэта прадстаўнік усёй рабселькораўскай армії БССР, гэта адзін з баявых атрадаў рабселькораў СССР, гэта частка сусьветнага рабкораўскага руху.

— Пэрыяд падрыхтоўкі да зьезду—гэта пэрыяд баявой інтэнсыўнай работы друку, рабселькораў за ажыцьцяўленьне бягучых задач, пастаўленых перад намі партыяй.

— Прымаючы пад увагу, што на зьезьдзе прысутнічае вялікая колькасьць вайсковых карэспандэнтаў, прапаную 2-гі ўсебеларускі зьезд рабселькораў лічыць: 2-гім усебеларускім зьездам рабочых, сялянскіх і вайсковых карэспандэнтаў.

Доўгімі бурнымі воплескамі зьезд адзначыў згоду з гэтай прапановай.

У прэзыдыум прынесьлі тэлеграму ад рэдакцыі «Правды», якая зараз-жа была агалошана. Зьезд цёпла сустрэў прывітаньне цэнтральнага органу УсеКП(б).

Пасьля прывітаньня ўдарнікаў заводу «Камунар», пасьля таго, як зьезд вылучыў дэлегацыі для прывітаньня ад імя зьезду па прадпрыемствах гораду Менску, слова было прадстаўлена сакратару ЦК КП(б)Б т. Гею для дакладу аб выніках пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і задачы друку.

З вялікай увагай зьезд выслухаў гэты даклад.

Пасьля дакладу тав. Гея зьезд віталі шматлікія рабкораўскія дэлегацыі прадпрыемстваў БССР: Гомельскага дэпо і чыгуначнага вузлу; чырвонаштандартнага заводу «Бальшавік»; друкарні імя Сталіна; швейнай фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі (Віцебск); менскай абутковай фабрыкі; менскага чыгуначнага вузлу; швейнай фабрыкі «Акцябр» і інш.

З адказнай прамовай на прывітаньне і рапарты ад імя зьезду выступіў тав. Курціх.

Дэлегат зьезду ад абутковай ф-кі т. Фрыд.

Дэлегатка зьезду ад абутковай ф-кі т. Готліб.

Ударнікам друку—пралетарскае прывітаньне

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў Беларусі горача вітае 1-ы ўсебеларускі Зьезд Рабселькораў—ударнікаў бальшавіцкага друку, актыўных змагароў за генэральную лінію партыі, за ажыцьцяўленьне 5-цігодкі ў 4 гады, за бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, за камуністычныя мэтады працы. Пад кіраўніцтвам Ленінскай Камуністычнай Партыі і яе ЦК, у барацьбе на два фронты і асабліва супроць правага ўхілу, як галоўнейшай небясьпекі на даным этапе, у барацьбе з клясавым ворагам, ліквідуючы самую шырокую і апошнюю апору капіталізму—кулацтва, як клясу, на базе суцэльнай калектывізацыі, у барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмам усіх колераў—рабочая кляса Савецкай Беларусі, як адзін з атрадаў пралетарыяту Савецкага Саюзу нябачнымі ў гісторыі тэмпамі будуе сацыялістычную прамысловасьць і сельскую гаспадарку БССР. Наша прамысловасьць за першае паўгодзьдзе дала больш на 35 проц. чым у першым паўгодзьдзі мінулага году, многія прадпрыемствы перавыканалі свой прамфінплян. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі перавысіла 40 проц. усіх гаспадарак. Гэтыя посьпехі зьяўляюцца вынікам правільнасьці генэральнай лініі партыі, правільнасьці кіраўніцтва партыі і яе ЦК, вынікам згуртаваньня мільённых мас рабочае клясы, батрацкіх і бядняцка-сераднякіх мас вёскі, у асноўнай масе сваей павярнуўшых на шлях калектывізацыі, навокал ленінскай комуністычнай партыі, вынікам гераізму і самаадданасьці іх у барацьбе за пабудову сацыялістычнай грамады. Аднак побач з гэтымі посьпехамі маецца шэраг прадпрыемстваў, прышоўшых да канца першага паўгодзьдзя 3-га рашаючага году 5-ці годкі са значнымі прарывамі, дзякуючы зьніжэньню гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый перабудаваць сваю работу «па новаму ў новых умовах».

Бальшавіцкі друк — магутнейшая прылада партыі і рабочае клясы ў барацьбе за бязумоўнае выкананьне пляну 3-га рашаючага году 5-ці годкі, бічуючы апартунізм, рабскія тэмпы і мэтады работы, бюракратызм, і закасьцяненьне, ускрываючы ўсе спробы клясавага ворага памяшаць нашаму будаўніцтву паказваючы прыклады работы па новаму і пераносячы вопыт заводаў—перадавікоў на адстаючыя прадпрыемствы—ня раз дабіваўся ліквідацыі прарываў. Гэтая задача зараз перад друкам і прафсаюзамі становіцца асабліва актуальнай. Мабілізаваць масы на выкананьне задач, пастаўленых т. Сталіным у сваёй прамове на сходзе гаспадарнікаў і забясьпечыць бязумоўнае выкананьне пляну 3-га рашаючага году,—уносячы яшчэ большую апэрацыйнасьць і канкрэтнасьць у барацьбе друку і кіраўніцтва партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый у гэтым сёньня сутнасьць, у гэтым аснова, у гэтым гвозд работы. Асабліву ўвагу Зьезд павінен удзяліць пытаньню барацьбы за аўладаньне тэхнікай: «Памножце накоплены ў барацьбе з бюрократызмам вопыт на тэхніку, адтачыце сваё пяро знаньнем тэхнікі і тады яно будзе таксама сьмярцельна паражаць шкодніка, як разіла да гэтага часу бюракрата».

Прэзыдыум ЦСПСБ выказвае ўпэўненасьць, што другі Ўсебеларускі Зьезд Рабселькораў яшчэ больш актывізуе рабселькораўскую армію, пашырыць яе шэрагі, рэалізуючы лёзунг: «Кожны рабкор-ударнік, кожны ўдарнік—рабкор». Яшчэ больш усіліць ролю друку ў перабудове прафсаюзнай работы, як аднэй з асноўных умоў выкананьня і перавыкананьня прамфінплянаў.

ЦСПСБ ад імя профсаюзных арганізацый БССР абяцае ўсямерную дапамогу і падтрымку армії рабселькораў у яе самаадданай рабоце.

За генэральную лінію партыі.

За бальшавіцкую непрымірымасьць супроць усякіх ухілаў і асабліва супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе.

За пралетарскую самакрытыку!

Няхай жыве камуністычная партыя бальшавікоў Беларусі, верны атрад УсеКП(б)

Няхай жыве ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Няхай жыве правадыр партыі і рабочае клясы тав. СТАЛІН.

Усеагульная забастоўка ў Беластоку

ВІЛЬНЯ. 9-7. «Дзеньнік Віленскі» паведамляе, што ў Беластоку рабочыя ўсіх тэкстыльных фабрык абвясьцілі забастоўку. Да забастоўкі далучаюцца рабочыя іншых прадпрыемстваў, а таксама камунальныя служачыя.

**Згодна паведамленьня газэты,

Накіроўваючы агонь па вялікадзяржаўным шавінізьме, галоўнай небясьпецы на даным этапе, ні на хвіліну не паслабляць барацьбы супроць беларускага нацдэмакратызму--гэтай агентуры польскага фашызму супроць шавінізмаў усіх колераў

Беларускія нацдэмы на службе ў бела-польскіх акупантаў 1919--1920 г.г.

(Па неапублікаваных дакумантах Цэн траархіву БССР)

У серадзіне чэрвеня 1919 году ў захопленым белапалякамі г. Вільні адбыўся беларускі зьезд, на якім былі «прадстаўнікі Віленскай і Гародненскай губэрняў. Якія «народныя масы» прадстаўляліся ўдзельнікамі гэтага зьезду невядома. На гэты конт ніякіх станоўчых дакумантальных данных ня знойдзена, да і ня варта іх было шукаць: «Млот», орган ЦК Кампартыі Польшчы, Літвы і Беларусі, якая выдавалася ў Менску да заняцьця апошняга белапалякамі, у № 138(126) ад 12 ліпеня 1919 г. поўнасьцю выкрывае, што гэтых «прадстаўнікоў» ніхто нідзе ня выбіраў і што ўдзельнікамі Віленскага зьезду была «жменька беларускіх інтэлігэнтаў, ня маючая ніякай апоры ў народных масах». Што вырашыў гэты зьезд? Акрамя выбараў т. зв. Цэнтральнай рады Віленскай і Гародненскай губэрняў, зьезд выказаў надзею, што «польскі народ» не захоча злаўжываць сваёй перавагай сіл і ня будзе перашкаджаць утварэньню незалежнай Літоўска-Беларускай Дзяржавы з сталіцай у Вільні.

Віленскі зьезд пад «польскім народам» разумеў белапольскіх гвалтаўнікоў з панам Пілсудскім на чале. Бо гэта ён, Пілсудскі, у язуіцкай адозве «да насяленьня б. В. Кн. Беларуска-Літоўскага» на другі дзень пасьля заняцьця Вільні, 22 красавіка 1919 г. абяцаў: «Хочу вам даць магчымасьць разьвязаць унутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы так, як самі захочаце, без якога-небудзь гвалту або націску з боку Польшчы». Дык вось удзельнікі зьезду «захацелі», ня маючы ніякай апоры ў беларускім «мнагапакутным народзе» на падставе гэтых «абяцанак-цацанак» Пілсудскага ўтварыць незалежную беларускую дзяржаву. Вынікі ўсяго гэтага «хаценьня» яшчэ раз пацьвярджаюць правільнасьць бальшавіцкай установкі, што вырашыць нацыянальнае пытаньне можа толькі пралетарыят і толькі пасьля заваяваньня ўлады. З боку белападкаўў беларускія нацыяналісты атрымлівалі толькі зьдзекі сільнага над слабым і дробныя пагардлівыя падачкі.

З дню абвяшчэньня адозвы Пілсудскага да заняцьця белапалякамі Менску мінула амаль што 4 месяцы. Аднак у беларускай нацыянальнай справе нічога рэальнага ня было зроблена, калі ня лічыць «ласкавага» дазволу панскіх гаспадароў на скліканьне ў Менску агульнага сходу беларусаў—сяброў і прадстаўнікоў беларускіх арганізацый г. Менску, якім 11 жніўня быў складзены т. з. «Беларускі часовы нацыянальны камітэт» дзеля «прадстаўніцтва ў польскім урадзе і ахове інтарэсаў беларускага насельніцтва ў мясцовасьцях, занятых польскім войскам». Зразумела справа, што ні мясцовы магістрат, ні іншыя арганізацыі, акрамя беларускіх, ні насельніцтва ня лічылися з Беларускім часовым нацыянальным камітэтам, ня бачачы ў ім рэальнай сілы, якая была толькі ў фактычнага гаспадара т. з. «Усходніх Зямель»—пераможнага польскага пана. Таму пасьля заняцьця Менску белапалякамі, мясцовыя гандляры, крамнікі і іншыя пачалі перамалёўваць шыльды на польскую мову не чакаючы афіцыйнага за гаду аб гэтым.

— «А чаму не па-беларуску, панове крамнікі? Аднак-жа Менск—сэрца Беларусі і беларуская мова афіцыяльна ўжываецца побач з польскаю? Глядзеце, каб ня прышлося зноў перамалёвываць!».

Гэта орган Беларускага нацыянальнага камітэту ў Менску, газэта «Звон» 25 жніўня 1919 году выказвае свае бясьсільле і дзіцячую надзею, што польскія паны, можа, прыкажуць крамнікам перамаляваць вывескі на беларускую мову.

Але праз 1½ месяцы Беларускаму нацыянальнаму камітэту зноў выпала горкая доля лемантаваць па другой падобнай справе: магістрат распачаў абазначаць вуліцы г. Менску таблічкамі толькі ў аднэй польскай мове. Прышлося вынесьці спэцыяльную пастанову ад 13 кастрычніка 1919 г. з патрабаваньнем «каб у сэрцы Беларусі—Менску ўсе робленыя магістратам шыльды, таблічкі з назвамі вуліц і наогул сталыя абвесткі абавязкова былі друкаваны і ў беларускай мове». Станоўчых вынікаў сваёй пастановы так і не дачакаўся бедны беларускі камітэт!..

Наадварот, дайшло нават да таго, што ў Менску настаўнікам беларускіх школ забаранілі пісаць да ўлады паперы па-беларуску, а павятовыя начальнікі не дазвалялі школьным інструктаром Беларускага нацыянальнага камітэту зьбіраць сялян дзеля ўтварэньня культурна-асьветных гурткоў і рабілі іншыя перашкоды. Так, напрыклад, інструктар па былому Ігуменскаму павету Залужскі 19 лютага 1920 году ў сваёй справаздачы піша: «...цэлы дзень хадзіў па ўрадах з сваімі дакумантамі, на каторыя яны пісалі свае і зрабілі ўціскі падобнага роду: 1) усе сходы павінны быць скліканы з павядамленьня раённага начальніка, 2) зьбіраць сходы забараняецца за граніцай фраштовай паласы, 3) сходы можна зьбіраць у кірунку нацыянальным, школьным, сельска-гаспадарчым і каапэрацыйным, а ў культурна-асьветным шэфам канцэлярыі этапу забаронена. Заяў і паперак ад нацыянальнага камітэту ўрады ня прымаюць напісаных па-беларуску і прапануюць заўсёды пісаць вытлумачэньне, а вытлумачэньне вы ведаеце пісаць як? Няхай яно трьмя пярунамі згарыць з іх вытлумачэньнем...».

Другі інструктар, К. Шышноўскі (па Менскаму павету) паведаміў, што 28 сьнежня 1919 г. на агульным сходзе настаўнікаў пачатковых школ м. Койданава памочнік школьнага інспэктара Ян Кайцыс заявіў, што «тыя навучыцелі, якія ня змогуць праз 1-2 месяцы весьці ў школах прэпадаваньне на польскай мове, будуць уволены з школы і на іх месца будуць назначаць другіх».

Замест здавальненьня «настойлівых» дамаганьняў нацыянальнага камітэту ў Менску і Цэнтральнай беларускай рады ў Вільні аб прадстаўленьні беларускім дэлегатам права ўдзельнічаць ў мірных перамаўленьнях Польшчы з Савецкай Расіяй, у польскі сойм у першай палове мая месяца 1920 г. быў ўнесен законапраект аб «адміністрацыйным упарадкаваньні Усходніх зямель «шляхам далучэньня іх да Польшчы. Гэты праект быў складзены польскімі народовымі дэмакратамі ,якія лічылі, што Беларусь нават у фэдэрацыі з Польшчай існаваць ня можа, бо яна ня мае сваіх «культурных сіл і ўсяго таго, што забясьпечвае мірнае дзяржаўнае існаваньне». Па думцы аўтараў законапраекту, такая дзяржава, як Беларусь, «акрамя турботы і клопатаў нічога ня дасьць Польшчы».

Гэткі погляд знайшоў спачуваньне ў польскім урадзе, які ў канцы красавіка 1920 году апрацаваў проект перасяленьня у Гародзенскую і Віленскую губэрніі 5 мільёнаў палякаў, (з гэтага ліку 2 мільёна з Познані). Адначасова з гэтым пачынаюцца расстрэлы і арышты левых беларускіх дзеячоў і зачыненьне Гародзенскіх і Віленскіх левых беларускіх газэт.

Палёнізатарская хваля разьліваецца па ўсёй акупаванай тэрыторыі... Польскі камітэт Беларусі склікаў у Вільні зьезд прадстаўнікоў сялян Гародзенскай і Віленскай губэрняў з тым, каб прымусіць яго вынесьці рэзалюцыю аб далучэньні да Польшчы. Аднак зьезд правалў гэтую рэзалюцыю і утварыў дэманстрацыю за «свабодную і незалежную Беларусь». Частка дэлегатаў зьезду была арыштавана.

Так ажыцьцяўляліся гаспадарамі «Усходніх Зямель» абнешчаныя адозвай 22 красавіка 1919 г. «сьветлыя мэты Вярхоўнага Начальніка»!..

Побач з гэтым «гаспадары паланяньня» ўсё-ж такі нешта рабілі і для беларускіх нацдэмаў. Драпежніцкая Польшча ў змаганьні супроць беларускіх партызанаў і Чырвонай Армії адчувала недахоп у войсках. Непадрэдная мабілізацыя беларускага насельніцтва ў польскую армію была надта небясьпечнай справай. Таму ідэя ўтварэньня беларускага нацыянальнага войска, уваходзячага, як асобная частка, у склад польскай арміі, знайшла спачуваньне у Пілсудзкага. Яшчэ ў жніўні 1919 г. была ўтворана ў Вільні «Беларуская вайсковая камісія», якая дабівалася распарадженьня польскае ўлады аб арганізацыі беларускага войска. У пачатку 1920 г. у Варшаўскай школе падхарунжых было заложана спэцыяльнае беларускае аддзяленьне, якое камплектавалася беларусамі з сярэдняй адукацыяй. Беларускай вайсковай камісіі было дазволена весьці агітацыю па вёсках у мэтах вярбоўкі добраахвотнікаў у войска. Сымоўкі добраахвотнікаў накіроўваліся ў Слонім, цэнтральны пункт фармаваньня беларускага войска.

Паны стараліся рабіць і далейшыя дзяшовыя «прыемнасьці» сваім не надта расьпешчаным і вымагальным слугам. Так, 29 сакавіка 1920 году Нацыянальны камітэт разаслаў «усім беларускім арганізацыям і нац. установам абежнік, у якім даводзіць да ведама гэтых арганізацый і ўстаноў, што польская ўлада дала згоду на тое, каб Беларускі нацыянальны камітэт у Менску ўзяў на сябе абавязкі «дапамагаць усяму беларускаму грамадзянству ў справе аслабаненьня арыштаваных палітычных абставінах і інш.» 30 сакавіка 1920 г. Беларускі нацыянальны камітэт радасна абвесьціў усе беларускія арганізацыі і установы аб тым, што згодна паведамленьня польскае улады «з гэтага часу статут усіх беларускіх арганізацый, якія ўжо заснаваны і якія маюць заснавацца, будуць прымацца на зацьверджаньне і перарэгістрацыю ў беларускай мове», а орган Язэпа Лёсіка «Беларусь» 19 мая 1920 г. друкуе ліст начальніка Менскай акругі ў магістрат г. Менску, у якім пан начальнік акругі паведамляе «што карэспандэньню ад беларускіх школ павінна прымацца ў беларускай мове і што забарона правядзеньня журналаў у гэтай мове не павінна мець месца».

Нарэшце, беларускім нацдэмам было вельмі прыемна даведацца, што дэкрэтам «Вярхоўнага Начальніка» гэ нэральны камісар Усходніх зямель пан Асмалоўскі (стаўленік Пілсудзкага, які служыў польскай шляхце і буржуазіі, а не беларускаму народу), з 1 чэрвеня 1920 г. стаў падлягаць непасрэдна радзе міністраў Польскай рэспублікі і атрымаў права голасу на пасяджэньнях рады міністраў «у пытаньнях датычных Усходніх зямель».

Былі і іншыя, больш дробныя панскія гасьцінцы, аб якіх за недахопам месца ня будзем гаварыць.

Так ці інакш, а «прадстаўнікі вызваленага ад бальшавіцкоў удзячнага беларускага народу»—Беларуская рада і Беларускі нацыянальны камітэт стараліся служыць «ласкавым» польскім панам верай і праўдай. Той хто ўпіраўся і не хацеў быць панскім лёкаем, павінен быў адмовіцца ад «служэньня народу беларускаму» і часьцей за ўсё ён пападаў пад апеку польскай жандармэрыі і паступаў на «дзяржаўнае забясьпечаньне ў квадратнай кануры». Іншым пашчасьцілася заняць польскія ўрадавыя пасады, пасьля чаго у іх «нацыянальным пачуцьці памерлі».

Рады выбыўшых папаўняліся больш выпрабаванымі слугамі капіталу. Так, 30 сакавіка 1920 году Беларускі нацыянальны камітэт у Менску пастанавіў прынясьці у склад сяброў Нацыянальнага камітэту прадстаўнікоў «Беларускага народнага брацтва імяні сьвятых Кірыла і Лаўрэнцыя Тураўскіх»—айцоў Сяргея Пакроўскага і Уладзіміра Бірулю. Раней былі прынятыя ў склад Беларускага нацыянальнага камітэту прадстаўнікі «Хрысьціянскай Дэмакратычнай Злучнасьці»—ксяндзы Цікота, Абрамтовіч і інш. Сярод гэткай публікі Лёсікі, Смолічы, Станкевічы, Родзевічы, Вернікоўскіх, Аляхновічы, Аўсянікі і інш. адчувалі сябе як рыба ў вадзе.

Галоўная задача ўсіх іх была—моцна трымацца польскіх паноў і толькі «пры магутным падтрыманьні Вольнай Польшчы» дабівацца «адраджэньня Вольнага беларускага народу на вольнай беларускай зямлі».

Аднак як раз сувязь з імпэрыялістычнай Польшчай не дапаматала, а перашкаджала «адраджэньню вольнага беларускага народу».

Інструктары Беларускага Нацыянальнага Камітэту, у сваіх справаздачах, усе як адзін, вымушаны прызнаць надзвычайна цяжкае становішча сялянства, стогнучага пад нязносным палітычным і эканамічным ўціскам белапалякаў.

Так, напрыклад, інструктар па школьных і нацыянальна - арганізацыйных справах Бабруйскага павету Кастусь Шчыгельскі 4 красавіка 1920 году піша: «... Жыве і дыхае тут народ у нейкай асаблівай атмасферы, якая насіць пранята «сьвістам» канчука і дубіны, да ўжываньня якіх вельмі ахвочы цяперашнія «гаспадары паланяньня». У бліжэйшых да фронту вёсках сялян згоняюць у адну хату, а іхнія хаты займаюцца салдатамі. Камэнданты цяперашняя «баці і цары» зусім падобны да ўрадніжаў часоў царскага рэжыму. Адменяюцца адзін ад аднаго толькі па вопратцы, а іншы раз і па мове. Працаваць каля сваіх гаспадараў «ніводзін з сялян амаль што ня мае часу. Кожны лічыць за вялікае шчасьце, калі мае ў тыдні два-тры слабодных дні, у якія ён крыху адпачывае ад прымусовых работ. Ніводнага кроку не можна ступіць без пропуску. Нават дзеля таго, каб вывезьці ў поле воз гною, альбо выехаць з плугам ці бараной трэба браць пропуск. У самым мястэчку Сьвіслачы жыцьцё зусім замёрла. Пасьля 7-й гадзіны не можна выходзіць ня толькі на вуліцу, але нават з хаты, бо можна напасьці на непрыемнасьць—быць забітым жаўнерамі, якія ў гэты час пачынаюць «аглядаць» гаспадарскія хлявы і цягнуць з іх што попадзе пад рукі...Цяпер амаль па ўсім павеце пачынаюць выбухаць паўстаньні. Так выбухнула паўстаньне ў Рудабельскай волаcьці, дзе селяне ішлі на палякоў з пяяньнем беларускай марсельезы «Ад веку мы спалі». Паўстаньне было зьліквідавана. Большасьць паўстанцаў разьбеглася, а чалавек 312 сівых старых сялян прыгналі ў Бабруйск на суд. Мабыць было надта «салодка» ад польскіх «прыязных» абходжэньняў, што не вытрымалі іх і старыя сяляне. У цяперашні час наш сялянін ня хоча і слухаць аб ніякай згодзе з палякамі, ён стаіць на грунце поўнай незалежнасьці і вельмі коса і нават з пагардаю глядзіць на тыя беларускія «дэмакратычныя» партыі, якія, як ён кажа, прыкрываючыся сацыялістычнай маскай, чамусь дзьмуць часам ў ня зусім сацыялістычныя польскія дудкі, калі гавораць, пасьля такіх зьдзекаў палякаў, аб цеснай фэдэрацыі з Польшчай».

Пры такіх адносінах белапалякоў да сялян нацдэмаўская палітыка панскіх лёкаеў сустракала на вёсцы, рашучы адпор. Працоўнае беларускае сялянства з кожным днём усё больш спачуваючы адносілася да бальшавікоў падпольля, папаўняла шэрагі партызанскіх атрадаў і нецярпліва чакала прыходу Чырвонай арміі. Намёк на гэта робіць у сваёй справаздачы нават інструктар Беларускага нацыянальнага камітэту па Ігуменскаму павету Залужскі, які, між іншым, адзначае: «Усюды бясьціцца ўсё беларускае з адлегла боку «гаспадамі», а з другога кажам а насяленьне чакае... Чаго? Гэта другі раз скажу...»

Што да нацдэмаўскай прапаганды на вёсцы праз друк, дык нейкі Віктар Таразовіч наступным чынам характарызуе газэту «Беларусь», якая выдавалася Беларускім нацыянальным камітэтам у Менску «пад агульным кіраўніцтвам Язэпа Лёсіка»: «як пагляджу я на сялян, чытаючых газэту «Беларусь» (на сялян-беларусоў, праўдзівых), дык мне успамінаецца чалавек сярод пустыні, якому дужа хочацца піць, ён гдесь-та знаходзіць ваду, кідаецца да яе піць, але яна горка-салёная... Як я даю каму чытаць газэту «Беларусь», дык дрыжу, баюся, каб ня было таго, што ў бальшавікоў з камунай. Надта добра было-б каб для народу была іншая газэта, хоць тыдневая. Няўжо-ж гэтага ніхто ня бачыць? (З вас, кіраўнікоў беларускага народу)».

А «кіраўнікі» гэта добра бачылі, бо яны напэўна чыталі справаздачы сваіх інструктароў, але... «скачы, вораж, як пан кажа». Адмовіцца-ж ад панскай апекі дробны буржуа,—ён сам хоча быць панам над другімі, і які баіцца бальшавікоў, як пекла,—ніяк ня можа!.. Таму Лёсікі, Станкевічы, Смолічы і інш. лічылі за лепшае канчаткова парваць сувязь з беларускім прапоўным людам, быць адкінутым ім проч ад нацыянальна-культурнага, эканамічнага і палітычнага будаўніцтва Беларусі, чымся зьмяніць свае старае, лёкайскае дробна-буржуазнае нутро на сацыялістычнае.

Тым горш для іх: «рэвалюцыя—віхор, які зьмятае з шляху свайго ўсіх хто супроцьстаіць яму».

А. Іодка.

М. ЧАРОТ.

Я ўспамінаю год дваццаты

(да дню вызваленьня)

Я ўспамінаю год дваццаты:
Плылі крывёю ўсе дарогі,
Быў сьцяг над Беларусьсю ўзьняты,—
Сьцяг бальшавіцкай перамогі...
Лінёвы дзень. Вайны пажары
У крыві людзкой даўно пагасьлі...
Дзе панскія былі абшары —
Квітнеюць з кожным днём калгасы.
Ударны тэмп. Працуюць шпарка
Сям'ёю дружнай калектывы...
У полі трактар і жняярка
Ні для каго цяпер ня дзіва,
А казкаю было нядаўна
Такі развой, такія штукі...
Сягоньня мараць аб камбайне,
Аб лепшых выніках навукі.
Чытальні-хаты, ясьлі, клюбы
Замест карчмы і гульняў дзікіх...
Няхай лінёвы дзень галубіць
Вольны прастор зямлі вялікай.
Савецкі край. Ты мілы сэрцу,
Да працы ты даеш натхненьне.
Я жыць хачу, а не памерці,
Каб радасьць несьці пакаленьню
А вораг пільна, пільна сочыць
За кожным нашым сьмелым крокам,
Ён сочыць днём, ён сочыць ночы,
І блізка ёсьць ён і далёка.
Таму і мы заўжды на варце
Павінны быць сваёй краіны...
Шчыльней ў рады з рабочым, стань-це,—
Мы з гэтай сілай—не загінем.
Ні інтэрвэнты, ні блёкады
І не паводка слоў хлусьлівых
Савецкага ня зрушыць ладу,
Бо наша мок—моц калектыву.
Лінёвы дзень. Шапоча жыта...
А сенажаць звініць касілкай...
Жыцьцё, жыцьцё хутчэй скажы ты,
Ці люд працоўны—не асілкі?
Далёка рэчка ўецца йстужкай,
Там сход калгаснікаў ля млына...
Да іх хачу ляцець я птушкай
Праз лес і горы і даліны.
Скажу я ім: таму вы верце,
Хто не гандляр сваім сумленьнем...
Хачу я жыць, а не памерці,
Каб радасьць несьці пакаленьню.

5-VII—31 г.

Чэрвеншчына сустрэла 11-годзьдзе калгасным прылівам

Пытаньне арганізацыі калгаснага прыліву імя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў па Чэрвеншчыне абгавар валася 7 ліпеня на раённым партсходзе і нарадзе сакратароў парт'ячэек. У раён паслана 45 работнікаў з раённага актыву для арганізацыі прыліву ў калгасы, папулярызацыі рашэньняў апошніх пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і прамовы тав. Сталіна. У выніку за апошнія дні арганізавана—3 новых калгасы імя 11 годзьдзя вызваленьня БССР і каля 200 бядняцка-середняцкіх гаспадарак уступіла ў існуючыя калгасы. Адначасова трэба адзначыць у сувязі з правядзеньнем сьвята 11 ліпеня,—лепшы ў раёне саўгас «Натальяўск» правыканаў плян веснавой сяўбы і выканаў ужо свой плян сіласаваньня. Рабочыя гэтага саўгасу далі бальшавіцкае абяцаньне партыі і ўраду ўборачную кампанію і асеньнюю сяўбу скончыць у максымальнакароткі тэрмін. Лепшыя калгасы ў раёне «Кастрычнік», «Перадавік», «Чырвоны Шлях»—падвоіць лік калгаснікаў. Калгас «Кастрычнік» выканаў ужо сваю праграму сіласаваньня. Па ініцыятыве калгаснікаў калгасу «Гута Пралетарская», аднаасобнікаў вёскі Дыі, Вайнілоўскага сельсавету і актыву Грабенскага сельсавету—ўсе калгасы Чэрвенскага раёну разам з аднаасобнікамі 11 і 12 ліпеня праводзяць двухдзеньнік па загатоўцы і вывазцы каменьня.

Ар. Рай.

Х-ігодзьдзе вышэйшай асьветы БССР--

буйнейшая перамога на фронце будаўніцтва культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу

Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту

Дзесяць год назад, толькі праз год пасьля вызваленьня ад белапалякаў, Беларуская ССР, зруйнаваная войнамі і акупацыямі, з разбуранай прамысловасьцю і занядбанай сельскай гаспадаркай ўтварыла першую вышэйшую навуковую ўстанову ў БССР—Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт.

Падводзячы вынікі дзесяцігадовага існаваньня БДУ Прэзыдыум ЦВК канстатуе, што БДУ зрабіўся сапраўды магутнай зброяй у руках рабочае клясы БССР, разгарнуўшыся ў моцную навуковую ўстанову па падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў для розных галін сацыялістычнага будаўніцтва.

Творчае навучаньне ва Унівэрсытэце шчыльна зьвязана з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва. Усьценах Унівэрсытэту вырока разгарнуліся мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Сотні настаўнікаў, дактароў, адказных работнікаў да гэтага часу выпусьціў БДУ. Падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў забясьпечана вытрыманымі марксыцка-ленінскімі навуковымі сіламі, якія зараз мае БДУ.

Віталочы Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт з дзесяцігодзьдзем слаўутага існаваньня, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР выказвае ўпэўненасьць, што і ў далейшым БДУ з гонарам выканае пачэсныя абавязкі ўскладзеныя на яго партыяй і савецкай уладай на падрыхтоўцы высокакваліфікаваных пралетарскіх кадраў да сацыялістычнага будаўніцтва.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. Гнілякевіч.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра наданьне прафэсарам Кролю, М. Б., і Гаўсману Т. А. годнасьці заслужоных дзеячоў навукі

Адзначаючы асабліва каштоўную навуковую дзейнасьць і актыўную працу ў падрыхтоўцы кадраў для сацыялістычнага будаўніцтва прафэсараў Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту КРОЛЯ, Міхася Барысавіча, і ГАЎСМАНА, Тодара Аскаравіча, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе надаць ім годнасьць заслужоных дзеячоў навукі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

10 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

Прывітаньне Усесаюзнай Акадэміі Навук

ЛЕНІНГРАД. Усесаюзная Акадэмія Навук шчыра вітае Беларускую Савецкую Рэспубліку і Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт у дзень сьвяткаваньня 10-гігодзьдзя вышэйшай школы БССР і шле брацкае пажаданьне далейшых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве гаспадаркі і культуры пад сьцягам ленінізму.

За неадменнага сакратара Акадэміі САМАЙЛОВІЧ.

Клінічны гарадок

ЦП Белпрацасьветы—БДУ

Кузьніцы пралетарскіх кадраў—Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту шчырае пралетарскае прывітаньне ад Цэнтральнага Праўленьня Саюзу Працаўнікоў Асьветы і 30-тысячнай арміі чырвоначтандарных асьветнікаў БССР у дзень 10-гадовага юбілею.

У барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, за культуру нацыянальную па форме і пралетарскую па зьместу, вы заваявалі пачэсвае месца ў справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва БССР.

Не здаваць заваёўваных пазыцый. Пад выпрабаваным кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ленінскага ЦК, у барацьбе на два фронты ўперад да далейшых перамог на фронце сацыялістычнай культуры.

Няхай жыве БДУ—магутная апора пралетарскай культуры Савецкай Беларусі.

Няхай жыве камуністычная партыя арганізатар і кіраўнік пасьпяховага разгорнутага сацыялістычнага наступу па ўсім фронце.

ЦП Белпрацасьветы.

10-VII—31 г.

Пад сьцягам партыі, у бой за пралетарскія кадры

У дзень 10-ці годзьдзя БДУ—Вышэйшай школы БССР, усёй шматлікай арміі навуковых, адміністрацыйна-тэхнічных працаўнікоў і тысячнай арміі студэнцтва Савецкай Беларусі—гарачае пралетарскае прывітаньне.

Ператварэньне ў сапраўднасьць Ленінскага наказу: «Дагнаць і перагнаць у найкарацейшы тэрмін капіталістычныя краіны» залежыць ад вырашэньня аднэй з галоўнейшых праблем рэканструкцыйнага пэрыяду—праблемы кадраў.

Вышэйшая школа БССР—кузьня падрыхтоўкі пралетарскіх спэцыялістых і заклікана партыяй і ўрадам да вырашэньня гэтай задачы, яна павінна ў далейшым цалкам забясьпечыць кадрамі той магутны раамах індустрыялізацыі, калектывізацыі і сацыялістычнай культуры, які ў Савецкай Беларусі дасягнуты пад кіраўніцтвам КП(б)Б.

Пад сьцягам партыі Леніна, у бой за пралетарскія кадры!

Нам. Наркома Асьветы БЯЛУГА.

Ад Беларускай Акадэміі Навук---Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту

Акадэмія Навук горача вітае Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, які ўступае ў другое дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня. Дзесяць год работы Унівэрсытэту, выпусьціўшага ўжо тысячы байцоў за сацыялізм, бясспрэчна буйнейшая падзея для нацыянальна-культурнага сацыялістычнага разьвіцьця БССР. Толькі пры дыктатуры пралетарыяту, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі было магчыма, што ва ўмовах самай лютай гаспадарчай разрухі, дзесяць год таму назад было прыступлена да арганізацыі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, стаўшага зараз адным з лепшых унівэрсытэтаў нашага Саюзу і зьяўляючагася магутнай зброяй пралетарыяту ў барацьбе за навуку і культуру. Беларуская акадэмія навук выказвае ўпэўненасьць, што і ў далейшым унівэрсытэт будзе даваць пралетарыяту новыя і новыя тысячы бальшавіцкіх байцоў узброеных ведамі, навукай і тэхнікай.

Рэканструкцыйны пэрыяд гэтыя задачы паставіў перад унівэрсытэтам ва ўсю шырыню. Барацьба за выкарчоўваньне карэньняў капіталізму, барацьба за пабудову сацыялістычнай грамады, усклада на Унівэрсытэт вельмі адказныя задачы. Нам патрэбны зараз тысячы і тысячы кваліфікаваных інжынэраў, эканамістаў, пэдагогаў, аграномаў, мэдыкаў, гісторыкаў, глебаведаў, статыстыкаў, геалёгаў, і многіх іншых спэцыялістаў. У першую чаргу задача Унівэрсытэту даць рэспубліцы гэтыя кадры. Справіцца-ж з гэтай задачай Унівэрсытэт зможа толькі ні на хвіліну не забываючыся, што выкананьне яе працякае ва ўмовах бязьлітаснай клясавай барацьбы, калі неабходна самае рашучае і бязьлітасная выкрыцьцё малейшых ухілаў ад задач, якія стаяць перад нашай партыяй і рабочай клясай. Толькі пільна стоячы на варце ленінскай палітыкі ў нацыянальным пытаньні, рашуча змагаючыся з малейшымі праявамі вялікадзяржаўнага і нацыянал-шавінізмаў і няўхільна вядучы інтэрнацыянальнае выхаваньне мас, БДУ будзе зьяўляцца сапраўдным прытулкам беларускай сацыялістычнай культуры. Гаворачы аб задачах Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, перад якім у нашы дні выпадае адказнейшая роля выпускаць новыя і новыя тысячы бальшавіцкіх байцоў-спэцыялістаў, недыя прайсьці міма другой важнейшай задачы Унівэрсытэту — падвышэньня якасьці ведаў нашых спэцыялістаў.

Бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва, які дае магчымасьць яшчэ нябачанага ў гісторыі размаху навуковай работы, усё настойлівей і настойлівей патрабуе ад нас спэцыялістаў, узброеных тэхнічнымі ведамі і галавой вышэй стаячых спэцыялістаў капіталістычнай грамады. Сапраўды веды спэцыяліста капіталістычнай грамады ўжо часта аказваюцца недастатковымі для таго, каб пабудаваць нябачаныя ў гісторыі заводы-волаты ці ўмела арганізаваць саўгасы ці калгасы разьмешчаныя на дзесятках тысяч га зямлі. Вось чаму барацьба за якасьць спэцыяліста зьяўляецца адным з рашаючых умоў у справе пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва.

Дзесяць год работы БДУ яскравая старонка ў гісторыі пралетарскай барацьбы. У бліжэйшыя гады на працягу якіх мы павінны перагнаць у тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны, ускладаюць на Унівэрсытэт адказьнейшыя задачы. Акадэмія навук упэўнена, што Унівэрсытэт пасьпяхова па бальшавіцку пераможа труднасьці, якія перад ім стаяць і ператварыцца ў яшчэ больш магутную зброю пралетарыяту ў барацьбе за сацыялістычную грамаду. Акадэмія Навук выказвае ўпэўненасьць, што ў далейшым унівэрсытэт пад кіраўніцтвам партыі і ні на хвіліну не адрываючыся ад рабочае клясы, выпусьціць новыя тысячы бальшавіцкіх байцоў-спэцыялістаў, умеючых арганічна злучаць у сабе рэвалюцыйны размах і глыбіню тэхнічных ведаў.

Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук П. ГОРЫН.

Галоўны корпус БДУ. У авале рэктар БДУ т. Каранеўскі.

Бабруйшчына сустракае 11-годзьдзе вызваленьня БССР ад белапалякаў магутным калгасным прылівам

Бабруйск. (Па тэлеф. ад наш. кар.). Дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў Бабруйскі раён сустракае новым калгасным прылівам і арганізацыяй новых калгасаў. За апошнюю дэкаду арганізавана 8 новых калгасаў.

Па вестках ад 44 калгасаў, у іх уступіла 274 новых бядняцка-середняцкіх гаспадарак а ў калгас імя Пяцігодкі ўступіла ў апошнія дні 20 гаспадарак, у Калгас «Свабода»—16, «Першага мая—12, «Сьвет»—30 гаспадарак.

У апошнія дні ў в. Падляды арганізаван калгас імя 1040. Ударныя тэмпы па калектывізацыі разгортвае Заратынскі сельсавет у якім за апошнюю дэкаду арганізована 5 новых калгасаў. Гэтае дасягненьне раёна мае ў выніку прыстасаваньня мэтаду дачы сацыялістычных наказаў.

А.

Узнагароджаньне ганаровымі граматамі

У зьвязку са сьвяткаваньнем 10-гадовага юбілею вышэйшай школы БССР, Савет Народных Камісараў БССР пастанавіў узнагародзіць ганаровымі граматамі наступных навуковых працаўнікоў: т. т. Перабілу, Тэпіна, Шапавалава, Гурло, Нікольскага, Грэдынгера, Прыляжаева, Мелніх, Сакалоў. скага, Рубашова, Корчыца, Камінскага, Маршака, Пракапчука, Манава, Выдрына і архітэктара Лаўрова, які будаваў Унівэрсытэцкі гарадок.

Слаўная XIII гадавіна

Беларускай дывізіі імя тав. Фрунзэ

Баявы шлях другой бальшавіцкай

13 год

Сёньня, у дзень сьвята 11-ці годзьдзя вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў, другая беларуская імя тав. Фрунзэ сьвяткуе 13 год свайго існаваньня. Баявы шлях дывізіі, паліты крывёю лепшых сыноў пралетарскай дзяржавы, якія аддалі сваё жыцьцё за дыктатуру пралетарыяту, за вызваленьне Савецкага Саюзу і Савецкай Беларусі ад замежных акупантаў і белагвардзейшчыны.

1918 г... грозны час для краіны саветаў... На палёх вайны вырашалася пытаньне—быць ці ня быць? Барацьба за дыктатуру пралетарыяту выклікала да жыцьця сотні, тысячы атрадаў чырвонай гвардыі, некалькі такіх атрадаў змагаліся на Тамбоўшчыне і Разаншчыне і з іх склалася цяперашняя другая дывізія. Цэнтрам фарміраваньня быў горад Разань.

У вельмі цяжкіх умовах нараджалася дывізія: недахоп зброі, харчоў, дэзэртырства, уплыў клясава-варожых элемэнтаў. Але рэвалюцыйны ўздым, воля да перамогі, разуменьне сваіх клясавых задач і адданасьць партыі дапамагалі яе стварэньню.

Першыя бойкі

Красавік, 1919 г.... дывізія перакідваецца ў Самару, дзе ў яе рады ўліваюцца новыя сотні пралетараў-палітработнікаў, палітбайцоў. Дывізія зацмантавана, гатова да бою.

4-га мая... Першае баявое спатканьне з Калчаком. Да 16-га ліпеня дывізія пераможна змагаецца з ворагам, захапляе шмат населеных пунктаў. Пад моцным агнём войск Калчака другая дывізія пераходзіць раку Белую і адкрывае дарогу для далейшага наступленьня чырвоных. Першыя баі яшчэ больш узьнялі рэвалюцыйную сьвядомасьць байца і камандзіра.

Абараняем горад Леніна

Пасьля бойкі на рацэ Белай на дывізію ўскладаюцца ганаровыя задачы абараніць горад Леніна. Дывізія перакідваецца на паўночна-заходні фронт. Адразу з вагонаў яна ўступае ў чатырохдзенны бесьперапынны бой з бандамі Юдзеніча. Для дывізіі наступаюць самыя цяжкія дні. Ёй прышлося адступіць ама

Сотнямі новых калгасаў

сустракаюць бядняцка-серадняцкія масы вёскі 11-ю гадавіну вызваленьня БССР ад белапалякаў

Новымі калгасамі сустракаем гадавіну вызваленьня

Усебеларускі заклік у калгасы імя 11-ці годзьдзя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, абвешчаны газэтай «Калгасьнік Беларусі» выклікаў вялікі прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы Заслаўскага раёну.

РК КП(б)Б мабілізаваў 22 членаў партыі і камсамольцаў у вёску для папулярызацыі закліку. Апроч, гэтага РК КП(б)Б даў дырэктыву ўсім таварышом камандыраваным у вёску для правядзеньня бягуча-палітычных гаспадарчых кампаній ўключыцца ў работу па правядзеньні Усебеларускага закліку.

Бяднякі і серадняк вёскі Валоўшчыны арганізавалі новы калгас імя газэты «Калгасьнік Беларусі» куды увайшло 14 гаспадарак.

Гэты прыклад павінны ўзяць усе бяднякі і сераднякі раёну, каб яшчэ большым прылівам у калгасы і арганізацыяй новых калгасаў паказаць працоўным Заходняй Беларусі, якія знаходзяцца пад уціскам польскага фашызму, як працоўныя Савецкай Беларусі змагаюцца за лепшае жыцьцё, будуючы калектыўныя гаспадаркі.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бяднякі і сераднякі Заслаўскага раёну сустракаюць дзень 11-ці годзьдзя вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў вялікім прылівам у калгасы—арганізацыяй новых калгасных гаспадарак.

Н. Г. Мядзьведзеў.

Нашы дасягненьні да 11-й гадавіны вызваленьня

Рапарт камуны „Чырвонаармеец"

Мы, камунары чырвонаармейскай камуны «Чырвонаармеец», Магілеўска га раёну, у ліку 166 асоб рапартуем да XI гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў аб нашых дасягненьнях.

Плян веснавой сяўбы камуны «Чырвонаармеец» выкананы на 106 проц.: трэба было засеяць 447 га, засеяна—474 га. Сіламі камуны на працягу вес навой пасеўкампаніі арганізаваны два новых калгасы з 28 гаспадарак. Камунары дапамаглі новым калгасам, якім ўзаралі 134 га. Апроч таго, найбольш адсталым калгасам камуна вызначыла пару коняй, 2 плугі і ўсю па трэбную збрую.

Камуна абяцае і ў далейшым уцягваць у калгасы ваколічных беднякоў і сераднякоў.

Камуна прыступіла да ўборкі сенажаці. Пачынаючы з 20-га чэрвеня, да 6-га ліпеня ўбрана 75 га канюшыны і 45 га сенажаці. Камунары даюць абяцаньне, што да пачатку жніва будзе поўнасьцю закончана ўборка сена.

Камуна «Чырвонаармеец» ударна правяла пяцідзёньнік праверкі і вучоту працы. Улічаны ўсе працадні і запісаны ў працоўныя кніжкі. Усе камунары забясьпечаны працоўнымі кніжкамі.

Камуна выканала заданьне па рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага» з перавышэньнем: паводле кантрольных лічбаў было вызначана 2.000 руб., а рэалізавана 2.500 руб.

Камуна прыступіла да поліва гарадаў. Першая праполка выканана на 80 проц.

Камуна вызначыла засіласаваць значную колькасьць зялёнай масы. Для гэтага засеяна 29 га сілосных культур, апроч таго будзе засіласаваны ўвесь бульбінік і націньні гароднины.

Сёлета праводзіцца значнае будаўніцтва ў камуне. Будуецца сьвіран на 4 000 цэнтнеры збожжа, заканчваецца будаўніцтва сталоўкі, клюбу, карэўніку на 300 галоў.

Тыя задачы, якія стаяць перадо і ўрад перад камунай «Чырвонаармеец» у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, будуць выкананы камунарамі з гонарам.

По даручэньні камуны «Чырвонаармеец».

Праўленьне.

1. Тав. ТРАХІМОВІЧ, брыгадзір-ударнік калгасу «Камінтэрн», Слуцкага р., атрымаў прэмію на зьлёце. 2. Тав. КАЛУГІНА, прэміяваная брыгадзірша-ударніца калгасу «Шлях да сацыялізму», Гомельскага р. 3. Тав КАЗЛОЎСКІ, прэміяваны на зьлёце брыгадзір-ударнік калгасу «III Інтэрнацыянал», Жлобінскага р. 4. Тав. ДАВІДОВІЧ, брыгадзір-ударнік калгасу імя Дзяржынскага, прэміяваны на Усебеларускім зьлёце ўдарнікаў-калгасьнікаў.

Калгас імя 11-га ліпеня

Аднаасобнікі - бяднякі і сераднякі Крывога Сяла, Анусінскага сельсавету, Заслаўскага раёну, прачытаўшы на старонках газэт аб усебеларускім калгасным закліку 11-годзьдзя вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў, успомнілі тыя катаваньні, якія 11 год назад перацярпела працоўнае насельніцтва Беларусі, ад белапольскіх гадаў.

У той-жа дзень бяднякі і сераднякі арганізавалі калгас імя 11 ліпеня, які аб'ядна 31 бядняцка-серадняцкую гаспадарку.

Зараз новыя калгасьнікі па-ўдарнаму ўзяліся за падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, абагулілі ўвесь рабочы інвэнтар і жывёлу і з вялікім энтузіязмам заявілі: «Мы не адстанем ў рабоце ад старых калгасаў і па-ўдарнаму правядзем уборку».

Н. М.

Арганізавана 2 новых калгасы

У час вучотна-падатковай кампаніі па Полацкім раёне была разгорнута шырока растлумачальная работа па калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У выніку гэтай работы ў Сястранскім сельсавеце арганізавана 2 новых калгасы: на Чэмесаўскім пункце «Гудок» з 20 гаспадарак, на Дайлідаўскім пункце «Чырвоны Будаўнік» з 15-ці гаспадарак.

Калгасы прыступілі да ўборкі сена. Рэшта калгасаў Сястрынскага сельсавету таксама маюць вялікі прыліў.

Язэп Саўчанка.

Вёска калектывізавана на 100 проц.

Бяднякі і сераднякі вёскі Валоўскай Рудні (Каралінскі раён) у ліку 52 гаспадарак у адзнаку 11-ці годзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў уступілі ў калгас.

Зараз гэта вёска калектывізавана на 100 проц. Калгас па ўдарнаму правядзіць уборачную кампанію. У час уборкі сенажаці кожны дзень на працу выходзяць 35—40 чалавек касцоў і 40 жанчын. На 5-е ліпеня калгасам скошана і ўбрана 80 га сенажаці.

Пракапенка Ільля.

У бой за торф

Апошнія дэкады

ператварыць у дэкады штурму прарываў на тарфяным фронце

Да канца торфасэзону засталося некалькі дэкад. Ня гледзячы на гэта, мы ў пляне торфаздабычы маем вялікі прарыў. На 7-га ліпеня каляндарны плян торфаздабычы выкананы на 35 проц., а сэзонны плян—на 19,3 проц. Асобныя торфазаводы, як «Чырвоная Беларусь», «Чырвоны Сьцяг» і «Калектыўная Праца» нават не разгарнулі работы па здабычы торфу ў гэтым сэзоне. Што можа абазначаць выкананьне сэзоннага пляну на 0,6 проц. («Чырвоная Беларусь»), або 7,5 проц. («Чырвоны Сьцяг»)?

Дзе прычыны гэтых прарываў? Ці ёсьць тут «аб'ектыўныя» ўмовы, на якія можна спасылацца пры выкананьні пляну гэтага году. Такіх прычын няма. Тарфяная прамысловасьць Беларусі мае ўсе даныя для выкананьня і перавыкананьня плянаў торфаздабычы. Аб гэтым сьведчыць работа заводу, «Чырвоны Тарфяньк», які ўжо перавыканаў свой плян, прыкладная работа брыгад т. Шчалкунова і Маслава, якія далі ўсесаюзныя рэкорды па дзённай здабычы торфу.

Толькі некалькі дзён таму назад мы пісалі аб прычынах ганебнага прарыву на Асінторфе. З усёй вострасьцю мы ставілі пытаньне аб тым, што невыкананьне пляну торфаздабычы Асін торфам стварае пагрозу апалавай базе БелДРЭС'у.

З боку Белторфу да гэтага часу няма адказнасьці за выкананьне пляну здабычы.

Мы ўжо ня раз пісалі аб тым, што Белторф ня быў падрыхтаваны да пачатку тарфянога сэзону, што мэханічны сэктар Белторфу ў прыватнасьці, зусім ня быў падрыхтаваны да пачатку тарфянога сэзону. Мы ведаем факты, калі з-за адсутнасьці некаторых нязначных частак для машын, апошнія стаялі несабраныя на працягу цэлага месяцу.

Ня гледзячы на тое, што друк неаднаразова сыгналізаваў аб дрэнным пастаноўцы прафработы на торфараспрацоўках, аб адсутнасьці сапраўднага сацспаборніцтва і ўдарніцтва, мы да гэтага часу належнага зруху не назіраем.

Партыйна-прафэсыянальныя арганізацыі яшчэ да гэтага часу не павярнуліся тварам да брыгады, да паасобнага тарфяніка. Работа гэтых арганізацый не перанесена ў барак. І ня гледзячы на тое, што партыйна-прафэсыянальныя арганізацыі на торфараспрацоўках адказваюць за пастаноўку культурна-масавай работы, мы да гэтага часу гэтай адказнасьці не адчуваем.

Друк неаднаразова ўзьнімаў пытаньне аб шэфстве спажыўцоў торфу над торфазаводамі. Да гэтага часу ніводзін завод не праводзіць гэтага шэфства так, як гэта было чакаць.

Былі выпадкі, калі асобныя заводжія арганізацыі нават адмаўляліся ад прыняцьця гэтага шэфства. (Эльвод, Менск). Зразумелая рэч, што гаварыць аб дапамозе з боку спажыўцоў ня прыходзіцца. Трэба лічыць, што адсутнасьць якой бы то ні было дапамогі з боку спажыўцоў, ускладае на іх частку адказнасьці за прарыў у пляне торфаздабычы.

ЦК КП(б)Б оваёй пастановай аб торфапрамысловасьці ў БССР абавязаў усе партыйныя арганізацыі разгарнуць работу па пасьпяховым правядзеньні тарфянога сэзону. Але гэтая пастанова марудна выконваецца. Перад пагрозай невыкананьня знаходзіцца дырэктыва партыі, аб ператварэньні БССР у тарфяны Донбас.

Так далей працягвацца ня можа.

Час, які застаўся да канца торфасэзону, трэба скарыстаць на тое, каб узмацніць тэмпы барацьбы за торф. **Апошнія дэкады павінны стаць дэкадамі бальшавіцкай барцьбы за торф, дэкадамі самаправеркі і ліквідацыі прарываў, дэкадамі бальшавіцкага штурму.**

Ужо час рыхтавацца да вывазкі торфу.

Падрыхтоўку да вывазкі торфу трэба паставіць на баявыя бальшавіцкія тэмпы.

Б. Т.

Рабочыя торфазаводу „Новая Беларусь" слаба змагаюцца за торф

Бабруйск. 10-7. (БЕЛТА). Сэзонны плян здабычы торфу заводам «Новая Беларусь» выкананы толькі на 40 проц. Дзённае заданьне выконваецца брыгадамі ўсяго на 50—80 проц.

Апошнія дні брыгада тав. Палявікова зноў выйшла на першае месца, давёўшы дзённую выпрацоўку на 93 пр. пляну.

Брыгада Іванова ў апошнія дні давяла выпрацоўку да 36.000 цаглін, супроць 34.000 цаглін дзённага пляну.

Пазыка „3-га рашаючага"

Засталося 21 дзень

Да 1-га жніўня рэалізацыя і афармленьне пазыкі ў вёсцы павінна быць скончана

Саўгасы, калгасы, МТС! Вы зьяўляецеся апорнымі пунктамі па разьмяшчэньні пазыкі сярод вясковага насельніцтва

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь і ЦП саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў

Рапарт Азарыцкага раймясцкому саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў

Па Раймясцкоме супрацоўнікаў нашага саюзу 24 чалавекі, сума зарплаты—2385 руб., ахоплена падпіскай 24 чалавекі на суму 2670 руб. Згодна пастановы агульнага сходу мясцком ўзяў на сябе абслугоўваць па падпісцы 6 прадпрыемстваў, 2 установы, 8 калгасаў, 1 саўгас і 5 вёсак.

Агульным сходам вылучана 19 брыгадзіраў.

Праведзены сход сіламі нашага саюзу па 8 калгасах, дзе падпіска афармлена. 3 таварышы выехалі на 5 дзён па дапамозе вучоту працы ў калгасах, якім даручана правесьці належную работу па рэалізацыі пазыкі і ў астатніх калгасах.

Праведзены сходы па індывідуальным сэктары пакуль-што ў двух вёсках, дзе таксама ўтворана падпіска. Праца працягваецца.

Райупаўнаважаны Саюзу Фінансава-банкаўскіх работнікаў па Азарыцкім раёне

Ліакумовіч.

На 100 процантаў свайго заробку

Рабочыя і служачыя саўгасу Бачэйкава, **Бешанковіцкага раёну**, падпісаліся на пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі», у ліку 124 чалавек на суму 6.150 руб.—на 100 проц. заработку і выклікаюць саўгасы трэсту Сьвінавод: Пачаевічы і Дзядзелева-Пашкова зрабіць тое-ж самае.

Раманенка.

На 500 працадзён

(Калгас «Камінтэрн», Лёзьнянчына). На агульным сходзе калгасьнікаў быў заслуханы даклад аб пазыцы «3-га рашаючага году». Калгасьнікі з энтузіязмам сустрэлі выпуск гэтай пазыкі і адразу на сходзе падпісалася на пазыку 30 чалавек на 500 працадзён, што складае 85 проц. іх сярэдняга месячнага заработку.

Неабходна адзначыць, што найбольш актыўнымі ў гэтай справе зьявіліся жанчыны.

М. К.

Адмовілася ад падпіскі на пазыку

Настаўніцтва «0» групы Бабчынскай ШКМ **Шурпо Тацьяна Мікіцічна** адмовілася ад падпіскі на пазыку «Трэці рашаючы» ў той час, калі была пастанова раённай канфэрэнцыі зьезьдзі кіраўнікоў і селькому, каб кожны зьезьдзік падпісаўся на 100 проц. заработку.

Ганьба такім настаўніцам.

Кушнер Цімок.

Сацспаборніцтва ў падпісцы

Рэалізацыя пазыкі «3-ці рашаючы» у Слуцку праходзіць з вялікім узьдымам. Рэалізацыя па горадзе скончана.

Калгасы і саўгасы раёну таксама ад гораду не адстаюць. Так, рабочыя саўгасу «Івань», калгасьнікі калгасу «Нова-Белічы», імя Леніна, «Магутны», «Вольнае жыцьцё» шырока разгортваюць паміж сабой сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Яны падпісваюцца на 100 проц. месячнага заработку.

Алесь Шпакоўскі.

Уключыцца і ўзяць першае месца

ва ўсесаюзным конкурсе на лепшую ўборку і хлебазагатоўку

«Крестьянская газета» абвесьціла ўсесаюзны конкурс на лепшае правядзеньне калгасамі і МТС уборачнай і хлебазагатоўчай кампаніі.

У журы пад старшынствам тав. Калініна ўваходзяць т.т. Якаўлеў, Мікаян, Юркін, Маркевіч, Саркіс.

Пасьпяхова праведзеная пасеўная кампанія зьяўляецца вынікам вялікага энтузіязму, выяўленага калгасамі і МТС, дзякуючы шырока разгорнутаму сацспаборніцтва паміж сабою, палявымі брыгадамі, і паасобнымі трактарыстамі.

Вялікую ролю ў дасягненьні гэтых посьпехаў адыграў цэнтральны і раённы друк, арганізаваўшы волю мас да перамогі на пасеўным фронце.

Зараз перамогу веснавой сяўбы трэба замацаваць яшчэ больш пасьпяховай уборкай і шпаркім ператварэньнем ураджаю ў тавар, у прадукт спажываньня для шырокіх працоўных мас нашага Саюзу.

Абвешчаны ўсесаюзны конкурс павінен быць падхоплены ўсімі ўдзельнікамі веснавой пасеўнай, якія павінны бязпакладна ўключыцца ў яго і забясьпечыць тыя арганізацыйныя формы, якія дадуць магчымасьць выявіць ідучых наперадзе па галоўнейшых паказьніках.

Першым мерапрыемствам па конкурсе павінны быць арганізацыі усебеларускага журы і штабу кіраўніцтва конкурсам.

Раённыя партыйныя, прафсаюзныя і савецкія арганізацыі павінны таксама ўключыцца ў гэты конкурс і ўзяць на сябе поўную дапамогу яму.

МТС і калгасы павінны бездакладна абгаварыць і прапрацаваць пытаньні, зьвязаныя з абвешчаным конкурсам, разьбіцца на спаборныя брыгады, стварыць усе ўмовы, спрыяючыя ўдарнаму правядзеньню работы, арганізаваць насьценгазэты там, дзе іх яшчэ няма, з асьвятленьнем ходу падрыхтоўкі і самага правядзеньня ўборачнай, малацьбы і рэалізацыі ўраджаю, выяўляючы пры гэтым лепшых ударнікаў, лепшых барацьбітоў за сацыялістычны ўраджай.

Па-баявому павінен уключыцца у гэты конкурс цэнтральны і раённы друк, які на вопыце лепшых калгасаў і МТС, на аснове лепшых паказьнікаў работы паасобных ударнікаў арганізуе сельскагаспадарчую армію на лепшае правядзеньне ўборачнай і хлебазагатоўчай кампаніі.

Газэты ў сваю чаргу павінны арганізаваць конкурс на лепшую рабселькораўскую карэспандэнцыю, якая асьвятляе выкананьне задач, пастаўленых усесаюзным конкурсам.

Усебеларускі рабселькораўскі зьезд павінен ў першы-ж дзень сваёй работы ўключыцца ў гэты конкурс, тут-жа намеціць рад мерапрыемстваў па лепшым ўдзеле ў ім і, разьехаўшыся на месцы, узьняць усю астатнюю рабселькораўскую масу на лепшае абслугоўваньне конкурсу.

Нашы 30 МТС на сваёй усебеларускай нарадзе, якая адбылася гэтымі днямі, ужо ўключыліся ў гэты конкурс і выклікалі на спаборніцтва МТС Заходняй вобласьці.

МТС у сваіх раёнах належыць галоўная арганізуючая роля ў гэтым конкурсе. Яны павінны выявіць лепшыя калгасы, уключыць іх у конкурс, арганізаваць у іх работу, укараніць правільную зьдзельшчыну, ажывіць у іх насьценныя газэты, арганізаваць селькораўскі актыў, найлепш абслужыць іх трактарамі і машынамі, ударная і бесьперабойная работа якіх будзе ўлічана пры выяўленьні паказьнікаў па ўдзеле саміх МТС у гэтым конкурсе і ў конкурсе, абвешчаным Трактарацэнтрам на лепшае скарыстаньне трактара.

Савецкая Беларусь, якая ў гэтым годзе пасеяла тэхнічных культур на 50-70 проц. больш, супроць даваеннага, здае сур'ёзнейшы экзамен па ўборцы і первічнай апрацоўцы гэтых культур.

БССР уключыўшыся ва ўсесаюзны конкурс павінна па-ўдарнаму змагацца за лепшае пасьпяховае правядзеньне ўборачнай і хлебазагатоўчай кампаніі, каб стаць на першае месца.

Б—Л.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

— 12-VII—г. г. а 7-й гадз. увечары пры Менскай Гар. КК-РСІ у залі Менгаркому (вул. Энгельса № 28) адбудзецца нарада работнікаў транспарту і клієнтуры па пытаньні, аб падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак.

На нараду павінны зьявіцца абавязкова і без спазьненьня прадстаўнікі ад наступных установаў і арганізацый: Плодагародніны, Саюзхлебу, Райкаапсаюзу, ЦРК, зав. Бальшавік, Швэйабяднаньня, Сампрамсаюзу, Белдзяржсна бу, ТПО, Ваентрадскладу, упр. 41 буд. вучастку, Лесбелу, Гаржылсаюзу, Абкамтрэсту, Белмалжывёлсаюзу, Белторфу, Глаўдортрансу, Мясакамбінату, зав. «Комунар», ф-кі «Камунарка», Саюзкож, Эльводу, Менск к-ра Будабяднаньня.

Ад чыгункі: Варкалевіч, Васіленка, Землякоў, Рытэр і ад Саюзтрансу—Крылоў.

Менская Гар. КК КП(б)Б-РСІ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Мендзяржтэатр — СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава. АІДА музыка Вэрдзі. Пачатак а 8 гадзіне. Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк — СЁНЬНЯ І ШТОДЗЁННА
1 гастроль эўрапэйскага атракцыёну ілюзіяністаў МАРЧЭС з яго трупай ліліпутаў
2. ДОНВАЛЬДА—Татарская трупа
3. ЭРНАНІ—Музычныя эксцэнтрыкі
4. АЎТАМАТ-ЛЯЛЬКА—Фрозэ
5. ЖАКЕЙ АЛЕКСАНДР
Пачатак а 8 г. 45 х. увечары. Білеты ў рабкасе. Адзінае гастраўленьне 12 ліпеня.

„Чырвоная Зорка" — Зямежны фільм ЧЫКАГО. Звыш праграмы кінохроніка Саюзкіно № 31. Пачатак а 7, 8-45 і 10-30. Каса з 5 г.

Кіно-тэатр „Культура" — З 10 ліпеня новы савецкі прыгодніцкі фільм ТРАНСБАЛТ—у гал. ролі артысты МІНІШ. Звыш праграмы часопіс Белдзяржкіно № 12 —Ударны Койданаўскі раён. Пачатак а 7 гадзіне.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Ната Вачнадзэ ў карціне ГЮЛІ. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно. Пачатак 1 сэаноў а 7 гадз.

ВІЦЕБСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў
Умовы прыёму, як і ва ўсе тэхнікумы, згодна даведніку НКА.
Асобы ня маючыя адукацыі за 7-годку, павінны зьявіцца ў тэхнікум 15—20 жніўня на іспыт.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 15 ЖНІЎКЯ г. г.
Заняткі пачнуцца 1-га верасьня. Аб залічэньні будзе паведамлена своечасова.
Інтэрнатам і стыпэндыяй забясьпечваюцца ў першую чаргу: рабочыя, калгасьнікі, саўгасьнікі і батракі.
ДАКУМАНТЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСУ: Віцебск, Дырэктару Вэттэхнікуму.
ДЫРЭКЦЫЯ.

АБ'ЯВА
Васілевіцкі Леспрамгасвуч абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР на 1-шы курс лесаэксплёатацыйнага і лесакультурнага аддзяленьняў:
Школа рыхтуе ніжэйшы адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал па лясных загатоўках і лясной гаспадарцы, а таксама скончыўшыя школу будуць прымацца ў ВНУ пасьля 2-х гадовай працы на вытворчасьці.
ТЭРМІН НАВУЧАНЬНЯ—2 ГАДЫ
У школу прымаюцца скончыўшыя 7-годку, ШКМ. Да заяў далучаюцца наступныя дакументы (абавязкова ў арыгінале):
1. Аб адукацыі (пасьведчаньне аб скончэньні 7-мігодкі, ШКМ).
2. Аб узросьце (мэтрыка).
3. Мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага.
4. Анкета, засьведчаная партыйнымі, прафэсыйнымі, альбо савецкімі ўстановамі.
5. Даведка аб карыстаньні бацькоў выбарчымі правамі.
6. Для сялян—укладны ліст, альбо засьведчаная копія яго аб падатку на 1930-31 г., а для саматужнікаў—аплаведны дакумант аб падатку на 1931 г.
7. Дакумант аб сацыяльным становішчы і матар'яльным стане паступаючага і яго бацькоў да рэвалюцыі і пасьля рэвалюцыі.
8. Дзьве фотографічныя карткі.
9. Пошчтовых марак на 30 кап.
Узрост паступаючага павінен быць ня ніжэй 16 і ня вышэй 19 год.
Заявы пасылаць у канцылярыю школы (ст. Васілевічы Зах. чыг. Леспрамгасвуч) да 15 жніўня 1931 г.
Пачатак заняткаў з 1 верасьня г. г. Стыпэндыя ад 23 руб. 52 кап., якая пасьля 6-цімесячнай пасьпяховай вучобы павялічваецца да 44 руб.
У першую чаргу стыпэндыяй будуць забясьпечаны рабочыя, батракі, бядняки, калгасьнікі і іх дзеці.
Усе прыезджыя забясьпечваюцца інтэрнатам альбо кватэрамі пры школе на вёсцы.
ПРЫ ШКОЛЕ МАЕЦЦА СТАЛОЎКА
Без паведамленьня школы аб прыёме прыезд забараняецца.
Адміністрацыя школы.
1—2

УРАЧЫСТАЕ ПАСЕДЖАНЬНЕ, ПРЫСЬВЯЧАНАЕ 10-ГОДЗЬДЗЮ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БССР,
АДБУДЗЕЦЦА СЁНЬНЯ, 11-га ЛІПЕНЯ,
а 7-й гадзіне ўвечары ў актавай залі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту
(Галоўны корпус, Унівэрсытэцкага гарадку).
УВАХОД ПА ЗАПРАШАЛЬНЫМ БІЛЕТАМ
Камісія па сьвяткаваньню вышэйшай школы БССР

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА — СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ
ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ
ДА РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА ЗЬЕЗДУ
1. Задачы бальшавіцкага друку. Цана 20 кап. Тыраж 5.000
2. Шаранговіч, Міцькоў і Курцік.—Тэмпы рашаюць. Цана 45 кап. „ 4.000
3. Пад сьцягам ўдарніцтва. Цана 32 кап. „ 7.000
4. Васкабойнікаў і Курцік.—На барацьбу за прамфінплян. Цана 20 кап. „ 10.000
5. У дапамогу фабрычна-друкаванай газэце. Цана 30 кап. „ 5.000
Прадаюцца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, спажыўкаапэрацыі і Саюздруку
Кіёск БДВ у памяшканьні зьезду прадстаўляе дэлегатам СКІДКУ 20 ПРОЦ.

ПАТРЭБНА машыністка, добра ведаючая беларускую мову, Зьвяртацца ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь"

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР і Беларускае аддзяленьне „АБШ" гэтым паведамляе, што ў горадзе Віцебску АДЧЫНІЎСЯ БЕЛАРУСКІ ТЭХНІКУМ па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі ў сельскай і лясной гаспадарцы і па вывучэньні хімічнай справы; у які пачаўся набор студэнтаў на 1 курс у ліку 80 асоб, з якіх 40 месц для БССР з выкладаньнем на беларускай мове і 40 месц для Заходняй вобласьці з выкладаньнем на расійскай мове.
Прыём будзе працягвацца да 1 жніўня г. г.
Залічваюцца без іспытаў асобы, скончыўшыя 7-мігодку і іншыя ўстановы адпаведнай асьветы. Правілы прыёму—па даведніку НКАсьветы на 1930-31 навучальны год для паступаючых у ВНУ і Тэхнікумы.
Усе члены ячэек Асоавіяхіму БССР і працаўнікі арганізацый Бел. АБШ жадаючыя паступіць у тэхнікум, пасылаюць на імя прыймовай камісіі пры тэхнікуме свае заявы з адпаведнымі дакумантамі і анкетаю, згодна з патрабаваньнямі даведніка НКАсьветы, па адрасу, г. Віцебск, Пляц Волі, 1.
Правілы прыёму разосланы па райсаветах Асоавіяхіму МІС і РІП арганізацый Бел. АБШ.
Аб залічэньні студэнтам Тэхнікуму, разьмеры вызначанай стыпэндыі і дні яўкі для заняткаў, Тэхнікумам будзе паведамлена асобна.
Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР. Беларускае аддзяленьне „АБШ".
1—2—3

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе Прыгавару Суду ад 23 мая 1931 г. па 196 арт. КК з санкц. па 1 ч. 213 арт. КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Яршову Базылю Мікітаву.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе Прыгавару Суду ад 19 сакавіка 1931 г. па 197 арт. КК з санкц. па 1 ч. 213 арт. КК, за перавышэньне сваіх праў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Гембіцкаму Адаму Янкаву.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе Прыгавару Суду ад 19 сакавіка 1931 г. па 196 арт. КК з санкц. па 1 ч. 213 арт. КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Будаю Ўладзімеру Янкаву.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе Прыгавару Суду ад 19 сакавіка 1931 г. па 196 арт. КК з санкц. па 1 ч. 213 арт. КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Лютынскаму Мікалаю Язэпаву.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе Прыгавару Суду ад 23 мая 1931 г. па 196 арт. КК з санкц. па 1 ч. 213 арт. КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Валодзька Пётры Іпалітаву.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—5 р., на год—12 руб.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Главлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА